

ПЕЧ ПАДРЫХТУЕШ — ПЕРАЗІМУЕШ **6**

УЛАСНЫ СТЫЛЬ ЯК СКЛАДНІК ПОСПЕХУ **7**



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 СТУДЗЕНЯ 2022 г. СУБОТА № 9 (29631)

## ЛІЧБА ДНЯ

**25 995 рублёў**

*складае памер сямейнага капіталу з 1 студзеня 2022 года, ён вырас на 9,5 працэнта, паведамілі карэспандэнту ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. У перыяд з 1 студзеня па 31 снежня 2021 года сямейны капітал прызначаўся ў памеры Br23 737,5. Сямейны капітал у памеры Br25 995 назначаецца сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей у перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2022 года. Сямейны капітал выдзяляецца ў памеры, які дзейнічае на дату нараджэння трэцяга або наступных дзяцей, а ў выпадку ўсынаўлення (удачарэння) — на дату ўсынаўлення (удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей, гэта значыць, у дзень уступлення ў сілу рашэння суда аб усынаўленні (удачарэнні).*



# «ЦАРСКІ» КАРАГОД



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вёсцы Семежава Капыльскага раёна напярэдадні старога Новага года адбыўся традыцыйны калядны абрад «Цары», які ўключаны ў Спіс ЮНЕСКА як аб'ект гісторыка-культурнай нематэрыяльнай каштоўнасці. Як і ў старажытнасці, у шчадроўны вечар па вуліцах аграгарадка маршыравалі маладыя мужчыны ў адмысловым белым адзенні, у папяровых цыліндрах ды з драўлянымі мячамі. Заходзілі ў двары, разыгрывалі маленькі спектакль пра цара Максіміляна.

СТАР. 12

## КОРАТКА

- **Беларускі воінскі кантынгент міратворчых сіл АДКБ вярнуўся дадому.**
- Работнікі СМІ ўдастоены дзяржузнагарод і Падзякі Прэзідэнта Беларусі.
- **У МНС ад Беларускай праваслаўнай царквы перададзена харугва.**
- Адменены дамашні матч хакеістаў мінскага «Дынама» супраць рыжан.
- **Перасоўную экспазіцыю аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны ствараць у Крычаве. Ініцыятарам стварэння экспазіцыі выступілі маладзёжны парламент пры Крычаўскім раённым Савеце дэпутатаў і Гістарычны музей Крычава.**

ISSN 1990 — 763X

Стыхія

# На шчасце, людзі не пацярпелі

### Наступствы непагадзі ў Мінску, Мінскай і Гродзенскай абласцях

**По аператыўных звестках МНС, з прычыны праходжання ўчора па краіне моцнага ветру з парывамі да 24 м/с пацярпелі Мінск і 11 населеных пунктаў у 8 раёнах Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей *(на момант, калі вярстаўся нумар)*. Пашкоджаны дахі 11 жылых дамоў, 3 сельскагаспадарчыя будынкі і 6 адміністрацыйных будынкаў.**

Зафіксаваны 22 выпадкі падзення дрэў у Гродзенскай (7 выпадкаў), Мінскай (7), Брэсцкай (1) абласцях і ў Мінску (7). Элементамі дахаў і паваленымі дрэвамі пашкоджана 11 аўтамабіляў у Мінску і ў Ваўкавыску. Пацярпелых не было. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і ўборцы дрэў. Вяліся аднаўленчыя работы.

Так, у службу 101 Гродзенскай вобласці ў першай палове дня паступіла пяць паведамленняў аб падзенні дрэў і адно паведамленне аб дэфармацыі металічнай канструкцыі.

У Астравецкім раёне тры дрэвы ўпалі на праезную частку аўтадарогі вёска Гудагай — пункт пропуску «Лоша». Таксама падзенне дрэў на праезныя часткі зафіксавана ў вёсцы Солы Смаргонскага раёна, вёсцы Эймінаўцы Бераставіцкага раёна і вёсцы Осава Воранаўскага раёна. У Ашмянах на тэрыторыі прыватнага домаўладання дрэва таксама не выстаяла перад парывамі ветру. Пацярпелых не было.

Работнікамі МНС аказвалася дапамога ў распілоўцы дрэў і зняцці элемента металічнага казырка. Таксама пашкоджаны 120 лістоў шыферу двух сельскагаспадарчых будынкаў і 20 лістоў шыферу прыватнага жылога дома ў Смаргонскім раёне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Размова па сутнасці

**Аляксандр КАДЛУБАЙ:**

# «ПАСПЯХОВЫ ПЕДАГОГ — АБ'ЕКТ ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ»

**Настаўнік — прафесія далёкага дзеяння. Пісьменнік жыве ў творах, мастак — у карцінах, а педагог — у думках і ўчынках сваіх вучняў. Ён знаходзіцца на прамой сувязі з кожным пакаленнем. У каго яшчэ ёсць магчымасць глядзець штодзённа вочы ў вочы сваёй будучыні, напаўняць жыццё дзіцяці сэнсам, спраўджваць яго чаканні?**

**Дык ці можа быць непрэстыжнай прафесія настаўніка? Хто і што робіць яе прэстыжнай? Што трэба зрабіць, каб у школу прыйшлі прафесіяналы? Аб усім гэтым мы гутарым з намеснікам міністра адукацыі нашай краіны Аляксандрам КАДЛУБАЕМ.**

СТАР. 4–5



Фота БелТА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба быць патрыётам, ганарыцца роднай краінай і трансліраваць гэта людзям»

**У Мінску прайшоў святочны прыём ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на стары Новы год. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэты прыём традыцыйна завяршае зімовыя святы. «Але ўжо першыя дні года, які наступіў, уцягнулі нас у імклівы вір вельмі негатыўных знешнепалітычных падзей. Падзей, якія шакіравалі і прымусілі беларусаў у думках вярнуцца ў 2020 год, яшчэ раз прааналізаваць і ацаніць, што мы маглі страціць, якую нацыянальную трагедыю прадухілілі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.**

Паводле яго слоў, усе гады сваёй незалежнасці беларусы з трывогай сочаць за лёсам многіх народаў, зрынутых каляровымі рэвалюцыямі. Але больш за ўсё ўзрушае нежаданне людзей вучыцца на чужых памылках і волыце. І ўражвае тое, якімі фатальнымі могуць стаць незасвоеныя ўрокі. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка назваў своечасовым рашэнне аб'явіць 2022-і Годам гістарычнай памяці. Па яго словах, каб не памыліцца ў будучыні, трэба азірацца ў мінулае. Чым часцей, тым лепей.

«Наша Беларусь займае няшмат месца на карце, але геапалітычную цікавасць прыцягвае да сябе велізарную. Так было заўсёды ў гісторыі нашай зямлі, так адбываецца цяпер. Так, мы сёння іншыя, іншы свет, але сюжэт палітычных інтрыг вакол той жа. Ён паўтараецца зноў і зноў. Мы з вамі ўжо шмат зрабілі для таго, каб летапіс беларускай дзяржаўнасці працягнуўся. І зробім яшчэ больш, бо мы адзіныя ў сваіх мэтах», — падкрэсліў беларускі лідар.

### «Вы фронтам усталі на абарону інтарэсаў дзяржавы»

Прэзідэнт падзякаваў усім, хто любіць родную краіну, адданы нацыянальным інтарэсам і разумее цяжар адказнасці, які лёг на плечы сучаснага пакалення. Асобна ён звярнуўся да журналістаў.

«Вы — на вастрыі падзей. Прапускаеце праз сябе факты і меркаванні, адпрацоўваеце інфармацыйныя выпады, адбіваеце іх. Летась з заклікаў вас працаваць больш жорстка, вы мяне пачулі. І не падвялі, моцна ўзяўшы інфармацыйны парадак дня ў свае рукі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На прыёме таксама прысутнічалі лідары грамадскай аналітыкі — гісторыкі, палітолагі, сацыёлагі. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, без перабольшання, ва ўмовах інфармацыйнай вайны іх інтэлект — гэта наймагутнейшая зброя.

«У крытычны момант гісторыі вы адным фронтам усталі на абарону інтарэсаў дзяржавы, праявілі сябе як сапраўдныя патрыёты. Асобна хачу падзякаваць усім, хто працуе плячо ў пляча з Прэзідэнтам у сферы дзяржаўнага кіравання. У адным з рэгіёнаў я сказаў, што ў ніводнага Прэзідэнта няма такіх людзей, як вы. Не таму, што мы ідэальныя ці няма ў нас памылак. Але мы даўно пайшлі ўперад у якасці дзяржаўнай улады. Канешне, гэта адносіцца да ўсёй вертыкалі ўлады. Ды і ў прынцыпе да ўсіх неабыякавых, хто хвалюецца за лёс краіны, беларусаў. Можа быць, я рэдка кажу, але ўпэўнены, што вы ведаеце, як высока цаню ўклад кожнага ва ўмацаванне і развіццё нашай краіны», — падкрэсліў беларускі лідар.

Асобна Прэзідэнт падзякаваў прызёрам Алімпіяды. Па яго словах, у мінулым годзе ім прыйшлося адначасова адстойваць і спартыўны гонар краіны, і палітычную пазіцыю нацыі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што больш няма размоў, што спорт, адукацыя, культура, ахова здароўя па-за палітыкай.

### «На постсавецкай прасторы неспакойна»

«Разумею, што ўсім хацелася б вярнуцца да звыклага, больш спакойнага рытму жыцця. Але вы бачыце: на постсавецкай прасторы неспакойна. Выбрана чарговая геапалітычная мэта. За ўсімі гэтымі падзеямі стаяць дзяржавы. І, заўважце, у жніўні 2020-га гэтыя дзяржавы (ведаеце, якія і чыімі рукамі) рынуліся да нас. Вядома, усю кашу заварылі іх спецслужбы. І мы іх бачылі, яны гэта не хавалі. Але тут мы ім рогі абламалі, і яны зрабілі высновы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Нам прыйшлося даць адэкватны адказ — на гэты раз калектыўны. Беларусь, Расія і іншыя краіны, некалі аб'яднаныя агульнай гісторыяй, сталі на абарону Рэспублікі Казахстан. А гэта гаворыць пра тое, што мы не растрацілі спадчыну савецкай эпохі — спадчыну непарушнага братэрства і моцных сувязяў паміж народамі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што падзеі ў Казахстане вучаць беларусаў быць вельмі ўважлівымі і акуратнымі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# УЗНАГАРОДЫ СПАРТСМЕНАМ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, у адпаведнасці з якім прадстаўнікі сферы спорту ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за дасягненне высокіх спартыўных вынікаў на летніх Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульнях 2021 года ў Токіа (Японія), паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Ордэна Айчыны III ступені ўдастоены спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па скачках на батуце Іван Літвіновіч, трэнер спартыўнай каманды Міністэрства ўнутраных спраў Марына Літвінчук, спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па веславанні на байдарках і каноэ Маргарыта Махнева, інструктары па спорце спартыўнай каманды Міністэрства ўнутраных спраў Надзея Папок і Вольга Худзенка.

Спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па вольнай барацьбе Магамедхабіб Кадзімагамедаў узнагароджаны ордэнам Пашаны. Гэтай жа ўзнагароды ўдастоены спартсмен-інструктар Спартыўнага камітэта Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Максім Недасекаў.

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны спартсмены-інструктары нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па інваспорце Лізавета Пятрэнка і Ягор Шчалканаў.

Ганаровае званне «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» прысвоена спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па інваспорце Ігару Бокію і спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па гімнастыцы мастацкай Аліне Гарнасько.

Добрая навіна

# Павышаецца зарплата сацыяльных работнікаў

**Са студзеня павышаецца заработная плата ў работнікаў сацыяльных устаноў, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

— Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады, а таксама Праграма дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2025 года вызначаюць прыярытэтнае павышэнне памеру аплаты працы асобных катэгорый работнікаў бюджэтнай сферы, у тым ліку работнікаў сферы сацыяльнага абслугоўвання, — адзначылі ў ведамстве.

Пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь № 88 устанаўлівае надбаўку з 1 студзеня 2022 года за работу ў сферы сацыяльнага абслугоўвання. Яна вызначана ў дыферэнцыраваных памерах у залежнасці ад катэгорый работнікаў і складае ад 20 да 90 працэнтаў базавай стаўкі (нагадаем, што са студзеня базавая стаўка — 207 рублёў).

У лічбах памер павелічэння зарплаты работнікаў устаноў сацыяльнага абслугоўвання складзе ад 41 да 186 рублёў. У далейшым надбаўка будзе павялічвацца прапарцыянальна росту базавай стаўкі. У 2022 годзе на гэта плануецца накіраваць каля 66 мільёнаў рублёў.

Акрамя таго, пастанова прадугледжвае дадатковыя меры матэрыяльнай падтрымкі для работнікаў дамоў-інтэрнатаў і аддзяленняў кругласутачнага знаходжання тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва за работу ва ўмовах інфекцыі COVID-19.

**Алена КРАВЕЦ.**

Гучная справа

# БЯДЫ ЎДАЛОСЯ ПАЗБЕГНУЦЬ...

**Затрыманы 45-гадовы мінчанін, які з выкарыстаннем самаробнай выбуховай прылады пашкодзіў міліцэйскі аўтамабіль. Аб гэтым паведаміў намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь КАЗАКЕВІЧ, перадае карэспандэнт БелТА.**

«У ноч з 7 на 8 студзеня 2022 года з выкарыстаннем самаробнай выбуховай прылады здзейснены падрыў службовага аўтамабіля каля будынка Цэнтральнага РУУС горада Мінска па вуліцы Арлоўскай. Таксама ўначы 13 студзеня 2022 года аналагічным спосабам пашкоджаны кіёск «Табакерка» і урна, размешчаныя паблізу дома № 91 па Старавіленскім тракце ў горадзе Мінску. Адразу ж была распачата крымінальная справа, створана следча-аператыўная група з ліку вопытных супрацоўнікаў ГУКВ МУС, ГУУС Мінгарвыканкама, Цэнтральнага РУУС, УСК па г. Мінску», — паведаміў Генадзь Казакевіч.

Паводле яго слоў, ужо 11 студзеня сышчыкі выйшлі на след злачынца, ім аказаўся 45-гадовы беспрацоўны мінчанін, які жыве непадалёк.

У жыллі і іншых памяшканнях затрыманага мінчаніна знойдзена не менш як пяць падрыхтаваных да выкарыстання выбуховых прыстасаванняў і ў вялікіх колькасцях розныя хімічныя рэчывы і кампаненты для іх вырабу, а таксама даведачная літаратура па выбуховых рэчывах, пораху і піратэхнічных саставах.

«У абодвух выпадках на месца здарэння выязджала следча-аператыўная група. У выніку аглядаў месцаў здарэнняў і іншых следчых дзеянняў знойдзены і канфіскаваны прадметы і аб'екты са слядамі ўздзеяння пашкоджвальных фактараў выбуху, часткі і элементы выбуховых прыстасаванняў, а таксама відэаматэрыялы. Прызначаны комплексныя экспертныя даследаванні, у тым ліку выбухова- і пажарна-тэхнічная, хімічная экспертызы, вытворчасць якіх даручана спецыялістам ГКСЭ», — заявілі ў СК.

У выніку правядзення сумесных з супрацоўнікамі крымінальнага вышуку Мінска следчых дзеянняў і аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў у поле зроку органа крымінальнага пераследу трапіў 45-гадовы мінчанін. Мужчына раней не судзімы і нідзе не працуе, неадназрова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за распіццё спіртных напояў і парушэнне правілаў дарожнага руху. Па гарачых слядах пасля ўчынення апошняга злачынства мужчына быў затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

«У далейшым у ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і першапачатковых следчых дзеянняў сумесна з УСК па г. Мінску атрыманы неабвержныя доказы супрацьпраўнай дзейнасці затрыманага: канфіскавана камп'ютарная тэхніка з інструкцыямі па вырабе выбуховых рэчываў і самаробных выбуховых прыстасаванняў, кампаненты, рэчывы і гатовыя самаробныя выбуховыя прыстасаванні. Таксама ўстаноўлена дачыненне затрыманага да пашкоджання кіёска «Табакерка» ў кастрычніку 2020 года і падрыву двух выбуховых прыстасаванняў 1 студзеня ля Цэнтральнага РУУС г. Мінска».

Затрыманы дае прызнальныя паказанні.

«МУС Рэспублікі Беларусь канстатуе захаванне пагрозы экстрэмізму і тэрарызму ў краіне, у тым ліку і з боку самарадыкалізаваных грамадзян. Прыведзеныя прыклады сведчаць аб агульнанебяспечным спосабе ўчынення злачынстваў. Хочам запэўніць грамадзян, што МУС і ў далейшым будзе аператыўна і эфектыўна працідзейнічаць гэтаму злу», — канстатаваў Генадзь Казакевіч.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША нарастае пакупніцкая паніка



У Злучаных Штатах за апошнія некалькі тыдняў абвастрылася сітуацыя з недахопам прадуктаў у супермаркетах на фоне імклівага распаўсюджвання амікрон-штама каранавіруса. Пра гэта паведаміла выданне Concord Monitor. Сітуацыя становіцца ўсё больш крытычнай, паколькі ўжо да наяўных праблем з лагістыкай і недахопам персаналу дадаліся марозныя надвор'е і распаўсюджванне амікрон-штама. Праблема з недахопам дальнабойшчыкаў у ЗША пачалася яшчэ да пандэміі і застаецца дастаткова вострай. У кастрычніку амерыканская асацыяцыя грузаперавозак заявіла, што ў ЗША не хапае прыкладна 80 тысяч кіроўцаў, што стала гістарычным максімумам. Частковая той дэфіцыт, які спажыўцы назіраюць зараз на паліцах крамаў, звязаны з пандэмічнымі тэндэнцыямі ў цэлым. Паводле даследаванняў, амерыканцы, што працуюць і вучацца аддалена, сталі ўжываць больш ежы.

### На Месяцы знайшлі ваду



Ва ўзорах месяцавага грунта, якія былі дастаўлены на Зямлю кітайскім касмічным апаратам «Чан'э-5», знойдзена вада, паведаміў партал National Geographic. Да гэтага моманту лічылася, што на Месяцы вады няма і быць не можа. Менавіта таму новае адкрыццё вучоных стала сенсацыяй. Сумесная даследчая група пад кіраўніцтвам навукоўцаў з Інстытута геалогіі і геафізікі Кітайскай акадэміі навук (IGGCAS) праводзіць работу па высвятленні, якім чынам вада магла трапіць на Месяц, дзе, па меркаванні навукоўцаў, з-за адсутнасці атмасферы яна не можа існаваць нават у выглядзе пары. Адной з прыярытэтных версій з'яўляецца здагадка, што ваду прынеслі сонечныя вятры. Вадкасць, па меркаванні навукоўцаў, можа быць злучана з мінераламі ў месяцавым рэгаліце, верхнім пласце пылу і друзу на паверхні спадарожніка Зямлі.

# БОЛЬШ ЗА ПЯЦЬ ТЫСЯЧ ПРАПАНОЎ

## паступіла ў Канстытуцыйную камісію ад грамадзян па зменах і дапаўненнях у Асноўны Закон краіны

**Аб гэтым расказала журналістам Старшыня Савета Рэспублікі, намеснік старшыні Канстытуцыйнай камісіі Наталля КАЧАНАВА падчас работы грамадскай прыёмнай пры Савеце Рэспублікі.**



### Ахвотных менш не становіцца

Грамадская прыёмная пры Савеце Рэспублікі працягвае сваю работу. У пятніцу, 14 студзеня, з грамадзянамі, якія маюць канструктыўныя прапановы па ўнясенні ў Асноўны Закон краіны, сустрэлася спікер верхняй палаты парламента. Ахвотных трапіць да яе на прыём менш не становіцца.

Дарэчы, прыходзяць людзі не толькі з прапановамі па ўнясенні змен і дапаўненняў у Канстытуцыю, але і па садзейнічанне ў вырашэнні грамадскіх ды асабістых пытанняў. Адзначым, што гэта ўжо другі прыём на гэтым тыдні, які праводзіць Старшыня Савета Рэспублікі. Сама ж грамадская прыёмная дзейнічае кожны панядзелак, сераду і пятніцу, прыём вядуць члены Савета Рэспублікі.

Першым на прыём да Наталлі Качанавай завітаў **старшы выкладчык інстытута бізнесу і права Аляксандр ПАПОЎ**, які выказаў некалькі заўваг адносна прапанаванага праекта Канстытуцыі. У прыватнасці, артыкул 5 заяўнік прапаноўвае дапоўніць тым, каб палітычныя партыі мелі магчымасць выяўляць палітычныя настроі і інтарэсы ў грамадстве. У артыкул аб складзе УНС лічыць неабходным дадаць прадстаўнікоў працоўных калектываў, а не толькі прадстаўнікоў грамадскасці. Працягваючы тэму Усебеларускага народнага сходу, Аляксандр Аляксандравіч лічыць, што паўнамоцтвы УНС аб прыняцці рашэння аб накіраванні вайсковага кантынгенту за межы Рэспублікі Беларусь неабходна дадаць фармулёўкай «за межамі адказнасці краін — удзельніц АДКБ».

Прапановы слушныя, пагадзілася Наталля Качанава і паабяцала падключыць кампетэнтных спецыялістаў да больш глыбокага іх вывучэння.

### Кожнае слова — на вагу золата

**Выкладчык Беларуска-расійскага ўніверсітэта Дзмітрый СЦЕПАНЕНКА** лічыць мэтазгодным дадаць у прэамбулу і артыкулы пра развіццё ідэі прыхільнасці дзяржавы навукова-тэхнічнаму прагрэсу і інавацыйнаму развіццю.

— Разам з сацыяльна-прававой дзяржавай дапоўніць і паняццем «інавацыйна-арыентаванай», — перакананы Дзмітрый Міхайлавіч.

Наталля Качанава не выключае такой магчымасці, але тлумачыць, што ў большай ступені гэтыя прапановы лепш адлюстроўваць у профільных законах, чым замацоўваць у Асноўным Законе.

— Прапісаць усё ў Канстытуцыі немагчыма. Яна павінна быць яснай, дакладнай і зразумелай для нашых грамадзян. Кожнае слова — на вагу золата, — падкрэсліве спікер і звяртае ўвагу, што ў любым выпадку Канстытуцыйная камісія абмяркуе агучаныя заяўнікам прапановы і вызначыцца з іх далейшым лёсам.

Яшчэ адзін заяўнік — **намеснік старшыні Беларускага саюза афіцэраў Васіль СКРЫННІКАЎ** — упэўнены ў мэтазгоднасці вылучэння ў асобны артыкул структуры Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу: яго колькаснага складу, парадку фарміравання і паўнамоцтваў.

— Мы плануем, што гэта будзе прапісана ў профільным законе, — тлумачыць Наталля Качанава і запэўніла Васіля Савельевіча, што на пасяджэнні рабочай групы яшчэ раз удзеляць увагу ўзнятаму ім пытанню.

Прадстаўнікі «Круглага стала дэмакратычных сіл» прыйшлі на прыём па садзейнічанне ў вырашэнні грамадскага пытання. **Юрысконсульт арганізацыі Павел ГАРДЗЯЮК** агучыў тэму сацыялізацыі амніставаных і іх працаўладкавання. Спікер верхняй палаты парламента паабяцала далучыцца да вырашэння ўзнятай праблемы.

### Пытанняў дастаткова шмат

Падводзячы вынікі правядзення прыёму, Наталля Качанава адзначыла, што ў краіне разгорнута шырокамаштабная работа па тлумачэнні навел, якія прадугледжваюцца ў Асноўны Закон.

— І людзі ўдзячныя за гэта. Я праводзіла сустрэчы ў працоўных калектывах, людзі кажуць аб тым, што гэта вельмі важна, — звярнула яна ўвагу.

Спікер адзначае той факт, што насельніцтва ўцягнута ў абмеркаванне праекта абноўленай Канстытуцыі.

— І тыя прапановы, якія абмяркоўваюцца на дыялогавых пляцоўках, у грамадскіх прыёмных і працоўных калектывах, цікавяць людзей, і яны разумеюць ступень сваёй адказнасці за будучыню дзяржавы, — падкрэслівае Старшыня Савета Рэспублікі. — Таму што гэта той закон, па якім давядзецца жыць не аднаму пакаленню, бо не так часта даводзіцца змяняць Канстытуцыю.

Аналізуючы аб'ём прапаноў, спікер звяртае ўвагу на тое, што іх дастаткова шмат. Паводле яе слоў, усе яны абагульняюцца ў Нацыянальным цэнтры прававой інфармацыі, а затым разглядаюцца на пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі і рабочай групы па дапрацоўцы праекта Канстытуцыі.

— Учора (13 студзеня. — **Заўв. аўт.**) мы чарговы раз разглядалі звароты, што паступілі. Усяго ўжо паступіла больш за пяць тысяч прапаноў ад нашых грамадзян, — паведаміла Наталля Качанава. — Канешне, яны структурызуюцца, бо сустракаюцца аднолькавыя.

Што датычыцца тэматыкі прапаноў, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што ў рознай катэгорыі людзей розныя і прапановы.

— Усе падтрымліваюць тое, што краіна павінна быць прэзідэнцкай. Абавязкова — сацыяльна-арыентаваная дзяржава, у гэтым няма ніякага сумневу, пра гэта кажуць усе, — акцэнтуе яна.

Наталля Качанава падкрэслівае: людзі ў большай ступені звяртаюць увагу на сацыяльныя гарантыі.

— Гэта і падтрымка сем'яў, што выхоўваюць дзяцей, і людзей, якія маюць інваліднасць, пенсіянераў, — пералічвае яна. — То-бок, кожны бачыць для сябе, што дзяржава як і прадугледжвала раней, так і будзе надалей падтрымліваць сваю сацыяльную накіраванасць.

Расказала Наталля Качанава і аб больш профільных прапановах.

— Ёсць людзі, якія паглыблены ў палітычныя працэсы і юрыдычныя пытанні. Яны прыходзяць на прыёмы па пытаннях прыярытэтнасці законаў, — кажа яна і ў якасці прыкладу прыводзіць пытанне «чаму не будзе дэкрэтаў?». — Гучаць пытанні па раздзеле «Парламент», дзе людзі кажуць, што, можа, не трэба пісаць: «Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь», а толькі «Парламент», бо з'яўляецца Усебеларускі народны сход.

Звяртае яна ўвагу і на тое, што практычна на кожнай сустрэчы ўзнікае спрэчнае ўспрыманне артыкула, паводле якога грамадзяне павінны апекавацца ўласным здароўем.

— Узніклі пытанні па артыкуле 54, дзе праяўленне патрыятызму і захаванне гістарычнай памяці — абавязак кожнага. Праяўленне патрыятызму — таксама пытанне, якое абмяркоўвалася ўчора дастаткова сур'ёзна, — падкрэсліла спікер.

Паводле яе слоў, артыкул, якім замацоўваецца тое, што шлюб магчымы паміж мужчынам і жанчынай, таксама выклікае сур'ёзныя абмеркаванні.

— На прыёмы прыходзяць людзі, якія вярнуліся ў Беларусь з іншых краін і кажуць аб тым, што зрабілі гэта, каб выратаваць сваіх дзяцей, — тлумачыць спікер. — Не так усё проста і добра ў еўрапейскіх краінах, і каштоўнасці, якія насаджаюцца там, сёння непрымальныя для Беларусі. Таму людзі просяць прапісаць у Канстытуцыі пытанні, якія звязаны з выхаваннем падрастаючага пакалення ў плане традыцыйных каштоўнасцяў.

Напрыканцы Наталля Качанава падкрэсліла: пытанняў дастаткова шмат.

— Хачу адказна заявіць, што людзі сапраўды сур'ёзна паглыбіліся ў працэс абмеркавання галоўнага закона нашай краіны. І гэта не можа не радаваць, таму што кожны, напэўна, успрымае гэта як сваё асабістае і будучае нашай краіны, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.**

### Дарэчы

Пасля прыёму спікерам верхняй палаты парламента ў другой палове дня сустрэчу з грамадзянамі працягнуў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, член Канстытуцыйнай камісіі Сяргей СІВЕЦ.**

Нагадаем: члены Савета Рэспублікі гатовы асабіста выслухаць усіх, у каго ёсць прапановы па праекце Асноўнага Закона, і адказаць на пытанні, якія хвалююць грамадзян, кожныя панядзелак, сераду і пятніцу.

У сувязі з вялікай колькасцю ахвотных звярнуцца да членаў Савета Рэспублікі такія сустрэчы праводзяцца па папярэднім запісе. Запіс ажыццяўляецца па тэлефонах: (8-017) 321-22-98, 327-46-74, 327-46-76.

У панядзелак, **17 студзеня**, сустрэчы з грамадзянамі праводзяць:

з 11.00 да 14.00 — **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ;**

з 14.00 да 17.00 — **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.**

---

**ДАСЛОЎНА**

**Таццяна РУНЕЦ:**

# «ПАДМУРАК ЛЮБОЙ НАЦЫІ — ЗАХАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ»



***Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:***

— Праект змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь утрымлівае шэраг канцэптуальных навацый, якія спрыяюць захаванню нацыянальнай самабытнасці. У прыватнасці, хацела б звярнуць увагу на з'яўленне ў артыкуле 15 тэзісу, што «дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны», а ў 54-м — што «праява патрыятызму, захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь». Што гэта значыць? Без захавання вех нацыянальнай гісторыі, памяці аб падзеях, якія адбыліся, не ведаючы мінулага — не пабудуеш будучыні. Здавалася б, відавочны факт, які не мае патрэбы ў дакументальным замацаванні ў Асноўным Законе краіны. Аднак праз 80 гадоў з моманту пачатку Вялікай Айчыннай вайны з'явілася тэндэнцыя перапісаць ход гісторыі.

Заходняя канцэпцыя кіравання грамадствам, якую мы выразна бачым на прыкладзе некаторых, у тым ліку краін блізкага замежжа, мае на ўвазе пабудову грамадства з ілжывымі маральнымі і гістарычнымі поглядамі, дэградацыю нацыянальнай культуры і самабытнасці. Мы бачым, як руйнуюцца краіны, руйнуюцца культуры цэлых народаў, нацый. Як прапагандуюцца чужыя грамадскія каштоўнасці, як перапісваецца гісторыя ва ўгоду інтарэсам трэціх краін.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла трэць свайго насельніцтва. Гэта ніколі не павінна паўтарыцца. Менавіта таму мы абавязаны захоўваць сваю гістарычную спадчыну і памяць пра падзеі тых гадоў.

Сыходзіць пакаленне, якое на свае вочы бачыла ўсе жахі войнаў, што пракаціліся па тэрыторыі нашай краіны ў XX стагоддзі, акупацыі, разрухі. Маладое пакаленне не павінна забываць у першую чаргу подзвіг дзядоў, якія выратавалі свет ад карычневай чумы. Не павінна забываць, якой цаной далася Перамога... Не павінна забываць пра этнацыд і генацыд беларускага народа. Бо гэта дазволіць шанаваць незалежнасць нашай краіны і абараняць яе.

Захоўваць гістарычную памяць неабходна з самых малых гадоў. Нашы нашчадкі, дзеці павінны разумець гэту гістарычную памяць са школы. Павінны ганарыцца сапраўднымі героямі і патрыётамі нашай краіны. Бо ўсё гэта дапаможа ганарыцца сваёй краінай, а значыць, і дазволіць захаваць суверэнітэт і незалежнасць нашай роднай Беларусі.

**Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі ды прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».**

# «ПАСПЯХОВЫ ПЕДАГОГ —



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## Натхніць на выбар

**— Аляксандр Уладзіміравіч, вось ужо некалькі гадоў запар у вядучай профільнай ВНУ краіны — Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце — канстатуюць рост цікавасці з боку выпускнікоў да педагагічных спецыяльнасцяў. Растуць і прахадныя балы. З чым звязана гэтая тэндэнцыя? Як лічыце, хто найперш павінен клапаціцца пра тое, якія людзі прыйдуць заўтра працаваць у школу? Педагагічныя ўстановы вышэйшай адукацыі, бо ім патрэбны студэнты? Адміністрацыя школ разам з настаўнікамі, каб было каму перадаць сваю справу? Ці грамадства, бо школа без настаўніка існаваць не можа?**

— Ключавым фактарам, які істотна змяніў сітуацыю з кантынгентам тых, хто паступае на педагагічныя спецыяльнасці, стала ўвядзенне ў 2015/2016 вучэбным годзе профільных педагагічных класаў на старшай ступені школы. Але работу па арыентацыі здольных ды паспяховых навучэнцаў на педагагічную прафесію, іх адбор у профільныя педагагічныя класы трэба распачынаць як мага раней. У адрозненне ад іншых прафесій агітацыя за прафесію педагога пачынаецца ўжо з першага класа і адбываецца кожны дзень на працягу адзінаццаці гадоў. Калі настаўнікі кажуць, што яны не могуць сфарміраваць педагагічны клас, бо да гэтага напрамку няма інтарэсу з боку навучэнцаў, няхай пашукаюць прычыны ў сабе. Ці бачылі іх вучні перад сабой упэўненага і самадастатковага чалавека? Між іншым, паспяховы педагог мае большы ўплыў на дзяцей і іх бацькоў, чым любыя сродкі масавай інфармацыі. Ён становіцца аб'ектам для пераймання. Чаму ўвогуле выпускнікі педагагічных ВНУ вяртаюцца ў школы, дзе навучаліся? Мяркую, што з прычыны атмасферы, якая там панавала, праз настаўнікаў, якія натхнілі іх на прафесійны выбар.

**«Выхоўваць сёння трэба, на жаль, не толькі вучняў — трэба выхаваць новае пакаленне бацькоў...»**

У рэаліях нашага часу вобраз настаўніка ў вачах бацькоў, а значыць, і грамадскасці, у большай ступені фарміруецца дзецьмі, з якімі ён штодня кантактуе. ***Настаўнік-няўдачнік, настаўнік-аўтсайдар, які ўвесь час скардзіцца на нізкі заробак і цяжкія ўмовы працы, адназначна ўспрымаецца дзецьмі як адмоўная мадэль жыцця, а прафесія настаўніка — як неперспектыўная.***

На жаль, у кожнай прафесіі ёсць выпадковыя людзі, для якіх паняцце «прафесійны гонар» — пусты гук. Але менавіта яны ў многім фарміруюць негатыўны імідж. У пэўны прамежак часу педагагічныя спецыяльнасці сталіся для некаторых абітурыентаў «запасным аэрадромам». Праца ў сістэме адукацыі іх мала цікавіла, таму многія пасля адпрацоўкі сышлі, але некаторыя ўсё ж такі засталіся. Лічу, што змены павінны адбыцца ў свядомасці саміх настаўнікаў, паколькі многія з іх, на жаль, лічаць, што займаюцца непрэстыжнай і малааплатнай працай. Таму не варта здзіўляцца, што калі такія педагогі прапануюць дзецям выбраць педагагічны клас, то энтузіязму з іх боку яны не назіраюць.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Увогуле, калі будзе добры настаўнік, то будзе і добры інжынер, і добры ўрач. Таму клапаціцца пра будучыню нашай школы павінны ўсе, не толькі вышэйшыя навучальныя ўстановы. А настаўнікі проста абавязаны думаць, хто прыйдзе ім на змену. Школы павінны «хварэць» за гэта душой! І педагогі, і адміністрацыя... Адкрыццё профільнага педагагічнага класа — справа адказная. Прычым адказнасць нясуць усе члены педагагічнага калектыву, бо толькі настаўніцкая згуртаванасць і ідэйнасць могуць натхніць вучняў на педагагічны шлях. У школе павінны быць адпаведны мікраклімат... Калі ў вас ёсць задума арганізаваць педагагічны клас, то пачынаць неабходна з сябе, са свайго стаўлення да гэтай прафесіі.

Быць педагогам — высокая місія і гатоўнасць вучыцца ўсё жыццё разам з дзецьмі і ў дзяцей. І добра, калі ў старшакласнікаў яшчэ ў школе ёсць магчымасць праверыць правільнасць свайго выбару. Не канстатаваць на трэцім-чацвёртым курсе, што памыліўся, а пераканацца ў сваіх здольнасцях і схільнасцях яшчэ падчас першых педагагічных спроб, здзейсненых у школе. Педагогіка — не работа на канвееры, а штодзённы клопат пра людзей. Таму матывацыя да прафесіі, напэўна, — самае важнае. І педагагічныя класы — наш надзейны падмурак у прафарыентацыі.

Добра і тое, што ў педуніверсітэце педагагічная практыка цяпер пачынаецца літаральна з першага курса, што, несумненна, змяншыць колькасць выпадковых людзей у школе.

## «Будзе цікава»

***— Аляксандр Уладзіміравіч, а як вы трапілі ў педагогіку? У вашай сям'і два педагогі — вы і жонка. Ці супадаюць вашы погляды па ўсіх пытаннях?***

— Педагогамі былі і мае бацькі. Яны знайшлі адно аднаго, калі працавалі ў сельскай школе, стварылі сям'ю. Па першай адукацыі бацька быў настаўнікам фізічнай культуры, а па другой — настаўнікам гісторыі, кіраваў сельскай школай. Дарэчы, яго матуля таксама была педагогам. Мая маці выкладала хімію і біялогію спачатку ў школе, а затым у прафесійна-тэхнічнай навучальнай установе. Таму я вырас, так бы мовіць, у лабаранцкай у маці, а бацька браў мяне з сабой у лагер працы і адпачынку, на ўсе школьныя мерапрыемствы... І я ведаў настаўніцкую працу абсалютна з усіх бакоў.

Калі напрыканцы 90-х гадоў вызначаўся з будучай прафесіяй, мае сябры выбіралі тады ВНУ сілавых ведамстваў. І я таксама вырашыў паступаць у цяперашнюю Акадэмію МУС. Аднак медкамісію па стане здароўя не прайшоў, таму пераарыентаваўся на гістарычны факультэт БДУ. Там і сустрэў сваю будучую жонку — мы вучыліся з ёй у адной групе. У адрозненне ад многіх нашых аднакурснікаў, якія прыкладалі ўсе намаганні, каб не трапіць у сістэму адукацыі, мы адразу былі настроены на работу ў школе. Такая перспектыва ніколькі не пужала, хоць пасля заканчэння БДУ былі прапановы займацца і навукай. Падчас размовы з кіраўніком раённага аддзела адукацыі ў мяне запыталіся: «У сельскую школу паедзеце?» Адказваю: «Паеду». — «А работы ў гімназіі не спужаецеся?» — «Не спужаюся».

**«Хачу запэўніць, што пра ліквідацыю агульнаадукацыйных ліцэяў размовы не ідзе. Яны захаваліся і ў Кодэксе аб адукацыі».**

У выніку мяне накіравалі і не ў сельскую школу, і не ў гімназію, а ў школу № 8 у Лідзе. Лічу, што мне вельмі пашанцавала: там быў выдатны калектыў і выдатны дырэктар. У школу прыйшло адразу больш як дзесяць маладых спецыялістаў, і ніхто не застаўся без увагі. Нас пастаянна збіралі, цікавіліся, якія ў нас ёсць праблемы, чым можна дапамагчы. За кожным замацавалі вопытнага педагога. Прычым гэта была зусім не фармальная апека маладых, так бы мовіць, для птушачкі.

Школа, дзе я пачынаў свой прафесійны шлях, была вельмі буйной — недзе на 1,5 тысячы навучэнцаў. А затым мяне накіравалі дырэктарам у Мажэйкаўскую сярэднюю школу. Там было 220—250 вучняў. Пераканаўся, што ў сельскіх школ свая спецыфіка. Гэта датычыцца нават стаўлення да настаўніка. Затое цяпер я ведаю шмат нюансаў і сельскіх, і гарадскіх школ.

У Лідзе давёў сваіх вучняў да 9 класа, а потым на маё месца прыйшла жонка, якая выйшла з дэкрэту. Таму ў нас з ёй ёсць агульныя вучні, якія цяпер віншуюць нас удваіх са святамі. У нашай сям'і трое дзяцей — дзве дачкі ў выпускным класе, а малодшая яшчэ ў садку. Таму мы з'яўляемся не толькі часткай сістэмы адукацыі, але і яе спажыўцамі. Дарэчы, нашы дзеці гулялі ў садзіку ў «педсавет», бо дома пастаянна чулі, як іх бацькі абмяркоўваюць прафесійныя моманты.

Няважна, хто ты: просты настаўнік або кіраўнік — меркаванні па пэўных пытаннях могуць не супадаць. Гэта абсалютна нармальна. Але ў нашай сям'і не было такога, каб мы не маглі дамовіцца. Я заўсёды аргументую сваю пазіцыю, жонка — сваю, і мы прыходзім да кансэнсусу. Гэтага ж прынцыпу прытрымліваюся і ў прафесійнай дзейнасці.

**«Адна з прычын недаверу — нізкая інфармаванасць бацькоў аб справах школы».**

Хачу запэўніць, што ніводнае важнае рашэнне не прымаецца на ўзроўні Міністэрства адукацыі без абмеркавання з педагагічнай грамадскасцю. Мы абавязкова прыцягваем да яго нашых настаўнікаў-метадыстаў, членаў клуба «Хрустальны журавель», выходзім у школы, цікавімся, што працуе, а што не працуе...

Дарэчы, калі мне — маладому яшчэ педагогу — прапанавалі класнае кіраўніцтва, я мог адмовіцца, таму пацікавіўся ў сваёй матулі яе меркаваннем. Яна падумала і сказала: «Бяры, будзе цікава»... Колькі разоў потым я прыгадваў яе словы, маючы ў класе амаль 30 вучняў *(смяецца)*. Класнае кіраўніцтва — вялікая адказнасць, праца фактычна ў кругласутачным рэжыме, але разам з тым надзвычай важны прафесійны вопыт! Ролю класнага кіраўніка ў выхаваўчым працэсе цяжка пераацаніць, таму напрыканцы года было прынята рашэнне аб выплаце надбавак за класнае кіраўніцтва штомесяц. Надбаўку за сваю няпростую працу класныя кіраўнікі пачалі атрымліваць ужо са студзеня 2022 года...

## Маладосць — недахоп ці перавага?

***— Педагагічная дзейнасць — патэнцыяльна творчая прафесія. Але ці раскрые малады настаўнік свой патэнцыял, залежыць не толькі ад яго. Школа не заўсёды гатова прыняць маладога педагога пакалення «next». Для старэйшых калег і адміністрацыі малады настаўнік — часта такі ж дзіўны і незразумелы чалавек, як, скажам, сучасны старшакласнік. Маладыя спецыяліст здзяйсняе шмат прафесійных памылак, ён менш дасведчаны ў многіх пытаннях. Аднак замест слоў падтрымкі часта ў яго адрас гучыць абразлівае: «І чаму вас толькі ва ўніверсітэце вучылі?» ці «Вы нават ГЭТАГА не ведаеце?»...***

— Наша рэчаіснасць вельмі дынамічная, і школа не павінна адставаць ад жыцця. Калі ў педагагічным калектыве з'яўляюцца прадстаўнікі зусім новага пакалення, калі новая парадыгма пракладвае сабе дарогу ў сістэме адукацыі, то і адміністрацыя школы, калегі павінны быць таксама «next», гэта значыць, гатовыя да змен, што адбываюцца. Маладосць — асаблівы час. Калі вы — маладыя, то не будзеце хадзіць пешшу, таму што можаце бегаць. Маладосць далёкая ад дасканаласці, але яна горача імкнецца да яе. Напэўна, нельга ва ўніверсітэце падрыхтаваць да ўсяго — настаўнік проста павінен быць гатовы да пастаяннага самаразвіцця і ўдасканалення. Сапраўднымі настаўнікамі становяцца толькі ў працэсе педагагічнай дзейнасці.

Свет набывае новую якасць, нават блізкую будучыню сёння цяжка прадказаць. Таму адміністрацыі школы трэба ісці ў нагу з часам і нават напалову кроку апяярэджваць яго, каб пры змене мэт, тэхналогій, рэсурсаў і г. д. не ўпусціць галоўнае — настаўніка, які стварае гэтую будучыню. Неабходна знайсці пэўны баланс паміж класікай і «next», інакш не зможам рушыць наперад. І маладым, і вопытным настаўнікам ёсць чаму павучыцца адно ў аднаго. Некаторыя настаўнікі сыходзяць са школы пасля размеркавання не толькі з прычыны невысокіх заробкаў, а таму, што не адчулі ў калектыве падтрымкі. У іх не паверылі. Таму ад адміністрацыі вельмі шмат залежыць...

## Не медыйная прафесія?

***— У педагогіцы сёння жаночае аблічча. Як можна затрымаць мужчын у нашых школах?***

— Сярод мужчын, на жаль, распаўсюджаны стэрэатып аб тым, што выхаванне дзяцей — выключна жаночы занятак, а задача мужчын — забяспечваць сям'ю. Але такая сітуацыя характэрная не толькі для нашай краіны. У Еўропе і Паўночнай Амерыцы назіраецца падобная тэндэнцыя: доля жанчын-педагогаў у школах расце. Мяркую, што толькі матэрыяльным заахвочваннем праблему не вырашыць. Паспяховыя мужчыны-педагогі кажуць, што ў школе можна зарабляць, калі ёсць такое жаданне. І не ўсё вымяраецца грашыма: добры спецыяліст ведае сабе цану і заўсёды выклікае павагу як у сваіх вучняў, так і ў іх бацькоў.

**«Веды без кампетэнцый нічога не каштуюць, гэта як чамадан без ручкі».**

А давайце прыгадаем, калі выйшаў апошні значны фільм, які найбольш ярка адлюстроўвае ролю настаўніка-мужчыны ў грамадстве? На памяць прыходзіць толькі стужка «Дажывём да панядзелка», створаная яшчэ ў 70-я гады XX стагоддзя. Так, ёсць выдатныя фільмы пра настаўнікаў, у тым ліку і сучасныя, але яны пра жанчын-настаўнікаў. Лічу, што нам патрэбны добрыя, пазітыўныя фільмы пра сучасную школу, п'есы і публікацыі, якія расказваюць

# АБ'ЕКТ ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ»

пра мужчын, што прысвяцілі сваё жыццё высакароднай мэце выхавання і навучання падрастаючага пакалення. Для таго, каб педагог стаў папулярным у грамадстве, ён павінен стаць медыйнай асобай. А медыйныя ў нас сёння іншыя прафесіі... Увогуле, павага да настаўніка — гэта элемент маралі сучаснага грамадства і яго сістэмы каштоўнасцяў.

***— Новая школа патрабуе новага настаўніка, які стане рухавіком перамен. Якім мусіць быць сучасны настаўнік?***

— Дакладна не звычайным уроказдацтва... 

— Дакладна не звычайным урокадаўцам. Гэта цікавы, харызматычны, адукаваны чалавек, поўны творчай энергіі, які выхоўвае такіх жа актыўных, неабыякавых і разважлівых людзей. Сучасны педагог — гэта «лічбавы» настаўнік, прагрэсіўны карыстальнік інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, здольны апярэджваць сацыяльную сітуацыю развіцця сучасных «лічбавых» дзяцей.

Ён валодае тэхналогіямі медыяцыі, прадукцыйнай камунікацыі, знаёмы з камунікатыўнымі кодамі пакалення Z (сучасных падлеткаў), пакалення Y (іх бацькоў) і пакалення X (дзядуль і бабуль). Яшчэ адна новая кампетэнцыя, якую дыктуе час, — гатоўнасць працаваць ва ўмовах інклюзіі. Сумеснае навучанне дзяцей з рознымі адукацыйнымі магчымасцямі, у тым ліку з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, — міжнародная тэндэнцыя. Не менш важная кампетэнцыя — уменне працаваць з сям'ёй. У пытаннях выхавання і сацыялізацыі дзяцей сям'я апошнім часам, на жаль, адышла на другі план, таму асноўны клопат лёг на школу. Сёння любы педагог, не толькі класны кіраўнік, але і настаўнікі-прадметнікі, павінны ўмець працаваць з бацькамі, ведаць асаблівасці сучасных сем'яў (няпоўных, неўладкаваных).

Педагогам сёння патрабуецца веданне псіхалогіі, уменне арганізоўваць работу ў камандзе. Паколькі мы самі не ведаем, што нас чакае праз 10—15 гадоў, значыць, і нашых выхаванцаў трэба вучыць жыць ва ўмовах нявызначанасці, непрадказальнасці, праблемнасці, вучыць іх лёгкай адаптацыі, мабільнасці, гнуткасці ў розных сітуацыях...

## Не староннія назіральнікі

***— Не сакрэт, што пэўная частка бацькоў даволі нізка ацэньваюць дзейнасць педагогаў і школы і не заўсёды ім давяраюць. Але школа не можа быць эфектыўнай без партнёрства з бацькамі, калі тыя не з'яўляюцца часткай агульнай каманды і не падзяляюць адказнасць з педагогамі...***

— На мой погляд, адна з прычын недаверу — нізкая інфармаванасць бацькоў аб справах школы. Што мы часта назіраем: бацькі тэлефануюць на гарачую лінію ў вышэйшыя інстанцыі, у міністэрства, хоць гэтыя пытанні і праблемы можна вырашыць на ўзроўні навучальнай установы. У бацькоў павінна прысутнічаць жаданне атрымліваць інфармацыю, аналізаваць яе і кантактаваць з педагогамі. І не варта крыўдзіцца, калі тыя недаступныя ў любы зручны для бацькоў вучня момант. Свой візіт у школу можна папярэдне ўзгадніць. У рэшце рэшт, ёсць школьныя суботы і бацькоўскія сходы. Трэба навучыцца выбудоўваць камунікацыю на ўзроўні класнага кіраўніка. Хоць мне здаецца, што такая форма, як бацькоўскія сходы, паступова адыходзіць на другі план, прынамсі ў буйных гарадах. Бацькоўскія чаты сёння значна больш аператыўныя і эфектыўныя. І педагогам абавязкова трэба там прысутнічаць, каб карэкціраваць паводзіны бацькоў, якія допускаюць абразы ў адрас школы. Выхоўваць сёння трэба, на жаль, не толькі вучняў — трэба выхаваць новае пакаленне бацькоў... Увогуле, настаўнікам гавораць шмат добрага ў святочныя дні, а дома дазваляюць зняважліва казаць пра іх пры дзецях.

Трэба зразумець, што бацькі, бабулі і дзядулі — не староннія назіральнікі, а людзі, якія разам з прафесійнымі педагогамі ўдзельнічаюць у выхаванні і навучанні.



Фота БелТА.

**Сталічная гімназія № 41 імя В. Сярэбранага пасля пераезду адкрылася ў студзені па вуліцы Чурлёніса, 18.**

І яны маюць права ведаць, што адбываецца ў сістэме адукацыі, як змяняюцца падручнікі, вучэбныя праграмы, якія інавацыі асвойваюцца, якія псіхолага-педагагічныя адкрыцці ўводзяцца ў практыку, а што ўжо аджыло свой век. Таму мы павінны ўсе важныя пытанні выносіць на грамадскае абмеркаванне, каб зрабіць бацькоў нашымі саюзнікамі, прычым саюзнікамі адказнымі.

Хачу дадаць, што, як правіла, досвед школ абмяжоўваецца ўзаемадзеяннем з паспяховымі сем'ямі і бацькамі, якія з цікавасцю прыходзяць у школу, разумеючы, што гэта карысна ў першую чаргу для іх дзяцей. Таму трэба імкнуцца прыцягнуць у школу ўсіх бацькоў, у тым ліку неактыўных і абыякавых. Большасць з іх лічаць, што яны ўмеюць выхоўваць сваіх дзяцей, а калі і ёсць памылкі і няўдачы, то вінаваты не яны. Трэба змяніць гэту сітуацыю і шукаць не вінаватых, а новыя шляхі ўзаемадзеяння школы і сям'і, каб бацькі сталі больш кампетэнтнымі, а дзеці — больш выхаванымі. У рэшце рэшт нездарма ж будучым педагогам выкладаецца ў ВНУ псіхалогія...

## Аналізаваць і рабіць высновы

***— Ключавыя кампетэнцыі ў XXI стагоддзі — крытычнае мысленне, крэатыўнасць, камунікацыя і кааперацыя. Але каб развіць гэтыя кампетэнцыі ў сваіх вучняў, настаўнік сам павінен імі валодаць. Тым больш у школах прызвычаіліся правяраць тое, што правяраецца на ЦТ, падчас маніторынгу ці міністэрскай кантрольнай работы...***

— Адна з задач, якая стаіць перад сістэмай адукацыі, — пераход на кампетэнтнасны змест агульнай сярэдняй адукацыі. Веды без кампетэнцый нічога не каштуюць, гэта як чамадан без ручкі. Калі я ведаю, як націскаць на педалі, гэта яшчэ не значыць, што я ўмею добра ездзіць. Сучасныя адукацыйныя трэнды задаюць арыенціры ў прафесійнай падрыхтоўцы будучых спецыялістаў для сістэмы адукацыі. У сувязі з гэтым калектывам навукоўцаў БДПУ быў распрацаваны праект прафесійна-кваліфікацыйнага стандарту педагога. У ім знайшла адлюстраванне новая кампетэнтнасная мадэль, якая арыентуе на фарміраванне ў педагога шырокага спектра новых, запатрабаваных кампетэнцый: для работы ў лічбавым адукацыйным асяроддзі, для работы ва ўмовах інклюзіўнай адукацыі, для ўстойлівай прафесійнай самарэалізацыі, для жыцця ў полікультурным свеце, кампетэнцыі ў галіне ўстойлівага развіцця і іншых.

Сёння асабліва актуальная падрыхтоўка педагога да фарміравання ў школьнікаў функцыянальнай адукаванасці. Калі інфармацыі вельмі многа, то можна ў ёй патануць, а засвоіць яе складана нават самай геніяльнай галаве. Ды і навошта? Важна ўмець правільна з ёй працаваць, выбіраць патрэбнае для сябе, аналізаваць, рабіць высновы, фарміраваць сваё меркаванне. ***Крытычнае мысленне — вось што насамрэч важна.***

**«Неабходна знайсці пэўны баланс паміж класікай і «next», інакш не зможам рушыць наперад. І маладым, і вопытным настаўнікам ёсць чаму павучыцца адзін у аднаго».**

Сёлета Беларусь другі раз будзе ўдзельнічаць у міжнародным даследаванні PISA, дзе правяраюцца не столькі акадэмічныя дасягненні 15-гадовых падлеткаў, колькі іх здольнасць выкарыстоўваць набытыя веды і вопыт для вырашэння шырокага дыяпазону жыццёвых задач, здольнасць вучняў устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, уменне супастаўляць факты, аналізаваць, хутка прымаць рашэнні. Тэсты PISA ўтрымліваюць тры асноўныя блокі: заданні на чытацкую (разуменне тэкстаў), матэматычную і прыродазнаўчанавуковую адукаванасць. У іх шмат тэкстаў, графікаў, табліц, малюнкаў, дыяграм, якія трэба ўважліва вывучыць, прачытаць (а для сучасных школьнікаў, якія не любяць вялікія тэксты, гэта, бадай што, самае складанае) і адказаць на шматлікія пытанні, што ідуць групамі, з прывязкай да канкрэтнага тэксту.

***Мэта PISA — вызначыць агульныя рысы і кірункі для далейшага развіцця сістэмы адукацыі.*** Вымярэнні выкарыстоўваюцца для таго, каб удасканаліць школу, павысіць канкурэнтаздольнасць яе выхаванцаў. Вынікі даследавання паказалі: каб стварэць на ўроках умовы для фарміравання ў школьнікаў чытацкай, прыродазнаўчанавуковай і матэматычнай кампетэнтнасці, патрабуецца найперш гатоўнасць самога педагога. І цяпер навуковыя калектывы БДПУ ў рамках галіновай навукова-тэхнічнай праграмы працуюць у гэтым кірунку: ствараюць навукова-метадычнае забеспячэнне, якое дазволіць падрыхтаваць будучых педагогаў да работы з вучнямі на аснове кампетэнтнаснага падыходу. Ужо падрыхтаваны шэраг дапаможнікаў з заданнямі на аснове кампетэнтнаснага падыходу, у прафесійнай прэсе друкуюцца артыкулы з парадамі, як педагогу самастойна скласці такія заданні. Мы моцна прасунуліся ў гэтым кірунку.

**Я заўсёды аргументую сваю пазіцыю, жонка — сваю, і мы прыходзім да кансэнсусу. Гэтага ж прынцыпу прытрымліваюся і ў прафесійнай дзейнасці.**

Кожны раз акцэнты ў даследаванні змяшчаюцца. У PISA-2022 упор будзе зроблены на вывучэнні матэматычнай адукаванасці навучэнцаў. Таксама ўдзельнікам будуць прапанаваны заданні на вызначэнне ўзроўню фінансавай адукаванасці і ацэнку крэатыўнага мыслення. Цікава будзе потым пазнаёміцца бліжэй з такімі заданнямі.

## Ліцэй ці профільны клас?

***— Падчас PISA-2018 навучэнцы некаторых беларускіх гімназій і ліцэяў паказалі ўзровень ведаў, які не саступаў лідарам сусветнага рэйтынгу. Але далейшы лёс агульнаадукацыйных ліцэяў не зусім зразумелы. Напрыканцы года з'явілася інфармацыя, што некаторыя ліцэі не будуць ажыццяўляць новы набор. Правілы паступлення ў ліцэі таксама змяніліся...***

— Нагадаю, што гісторыя стварэння агульнаадукацыйных ліцэяў пачынаецца з 90-х гадоў XX стагоддзя. Напрыклад, ліцэй БДУ быў створаны ў 1989 годзе. Ліцэйская адукацыя існуе толькі на старшай ступені школы. І яна была запатрабавана, бо ліцэі рабілі стаўку менавіта на профільнае навучанне. Але сёння профільныя класы могуць адкрывацца ў любой установе адукацыі, дзе ёсць для гэтага ўмовы і педагагічныя кадры. І паўстала заканамернае пытанне: а чым жа тады ліцэі адрозніваюцца ад старшай ступені школы? Быў праведзены аналіз іх дзейнасці. Мы даведаліся, што ў некаторых установы залічвалі навучэнцаў, якія атрымалі зусім нізкія балы на ўступных экзаменах. Ёсць ліцэі, куды могуць трапіць толькі гарадскія дзеці, бо там няма свайго інтэрната. Больш за тое, ліцэі арандуюць памяшканне ў школ. І некаторыя настаўнікі працуюць паралельна і ў ліцэі, і ў школе.

Таму ***мы прапанавалі мясцовым органам улады ўпарадкаваць работу ліцэяў. Адна з умоў — даць магчымасць навучацца ў іх дзецям з любога кутка краіны.*** Прыехаў, здаў паспяхова экзамены, прайшоў конкурсны адбор, цябе забяспечылі месцам у інтэрнаце — калі ласка, вучыся. Плюс мы ўстанавілі адзіныя для ўсіх ліцэяў тэрміны прыёму. Цяпер заявы ў 10-я класы будуць падавацца толькі на працягу чатырох дзён — з 12 да 15 чэрвеня. Гэта таксама датычыцца і Ліцэя БДУ, куды раней школьнікі маглі падаваць заяўкі з красавіка да мая. Уступныя іспыты пройдуць з 16 чэрвеня да 1 ліпеня.

**«Паспяховы педагог мае большы ўплыў на дзяцей і іх бацькоў, чым любыя сродкі масавай інфармацыі».**

***Усе ўступныя іспыты ў ліцэях будуць праводзіць толькі пісьмова. Распрацоўваць заданні для будучых ліцэістаў, адказы і крытэрыі ацэньвання будзе Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў,*** які кожны год рыхтуе цэнтралізаванае і рэпетыцыйнае тэсціраванне для абітурыентаў, а таксама заданні для абласнога і рэспубліканскага тураў школьных алімпіяд. Заданні для будучых ліцэістаў будуць захоўвацца ў зашыфраваным выглядзе на электронным носьбіце і перадавацца ў дзень здачы прадметаў экзаменатару. Раней гэтым займаліся тэрытарыяльныя органы кіравання адукацыяй, а таксама аддзелы адукацыі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, толькі для Ліцэя БДУ заданні распрацоўваў БДУ.

Ёсць і іншыя змены. Усе яны размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі.

Хачу запэўніць, што пра ліквідацыю агульнаадукацыйных ліцэяў размовы не ідзе. Яны захаваліся і ў Кодэксе аб адукацыі. Больш за тое, аб адкрыцці свайго ліцэя ў наступным вучэбным годзе абвясціў Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. Машэрава. Адметна, што ліцэй будзе агульнай сярэдняй установай адукацыі, якая ўваходзіць у структуру ўніверсітэта. Навучанне арганізуюць там па трох профілях: фізіка-матэматычным, хіміка-біялагічным і гуманітарным. А выкладаць у ліцэістаў будуць найлепшыя прафесары, дацэнты і выкладчыкі ВНУ, якія маюць вялікі досвед працы з таленавітай і адоранай моладдзю. Ліцэісты атрымаюць доступ у камп'ютарныя класы, навукова-даследчыя і спецыялізаваныя навучальныя лабараторыі, цэнтры замежных моў, найбуйнейшую навуковую бібліятэку. Ва ўніверсітэце спадзяюцца выхаваць моладзь, адданую сваёй альма-матар, і прыцягнуць у свой ліцэй дзяцей з усяго віцебскага рэгіёна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Выпрабавана на сабе

# ПЕЧ ПАДРЫХТУЕШ — ПЕРАЗІМУЕШ

## Навошта бяліць комін, калі яго чысціць і чым сілкаваць «сэрца» хаты?

**Запаліла аднойчы мая матуля ў печы, а дым раптам не ў комін, а ў хату пайшоў. «Вось дык неспадзяванка: печ жа толькі гадоў сем як нанова перарабілялі — павінна працаваць як мае быць», — падумалася мне тады. Кінулася шукаць паратунку ў спецыялістаў, якія адразу сказалі: справа найхутчэй у тым, што печ даўно не чысцілі. Аказалася, калі паліш у ёй толькі ліставымі дровамі, то комін можна не чысціць вельмі доўга, а вось калі дадаеш торф — варта чысціць раз на тры гады. Але самы бяспечны варыянт — рабіць гэта штогод напачатку ацяпляльнага сезона.**



### ЯК САЖА СТАНОВІЦЦА СМАЛОЙ

Бадай што самыя небяспечныя дровы для печы — хваёвыя. З-за іх смалістасці комін хутчэй забруджваецца, ды і рызыка ўзгарання сажы большая, а патушыць такое полымя вадой практычна немагчыма. А вось асіна, наадварот, мае «ачышчальны эфект» для коміна. Самы небяспечны варыянт — паліць толькі брыкетам, бо коміна вельмі хутка «зарастае» сажай. А пры доўгай адсутнасці гаспадароў у ім могуць з'явіцца новыя жыхары: птушкі ці шэршні. Як правільна абыходзіцца з печчу, каб яна добра награвала хату, расказалі камінары, якія абслугоўваюць Гродзенскую, Мінскую і Брэсцкую вобласці.



Многія ўяўляюць, што камінар, каб пачысціць комін, абавязкова палезе на страху і адтуль будзе засоўваць у трубу ёршык. Аказалася, наадварот: прылада засоўваецца ў грубку і па каналам уздымаецца на самы верх так, што кончык ёршыка тырчыць з трубы. Пачысціць печ — справа даволі адмысловая, бо не існуе стандартнай схемы яе пабудовы, але ж прынцып адзін, таму, набіўшы руку, спраўляешся з любой. Вядома, калі печ не закінулі канчаткова, сцвярджаюць майстры.

*— Калі канструкцыя печы простая і ў ёй няма мудрагелістых каналаў для дыму, то можна чысціць яе радзей. Аднак печ, якая «спажывае» брыкет, лепш чысціць рэгулярна. За летні час, калі ў печы не паліцца, яна становіцца крыху вільготнай, і сажа, што застаецца ў коміне ад спальвання торфу, робіцца як смала — крышталізуецца. Калі печ пасля падпальваеш, гэтая смала абпальваецца, і насланне павялічваецца. Здараецца, комін забруджваецца настолькі, што яго ўжо не пачысціць — застаецца толькі печ перарабляць. Смалістыя адкладанні моцныя, як бетон. Менавіта таму і не варта паліць толькі брыкетам,* — кажа Ян. — *Сажа назапашваецца нават на юшкі, і яе становіцца цяжка адчыняць і зачыняць.*

Акурат у гэты час менавіта юшку ён і чысціў, бо тая сапраўды ўжо амаль не рухалася з месца і зачыніць яе было цяжка. На паверхні бліскучэла тая самая чорная смала. Тут «дапамаглі» яшчэ і ападкі, якія трапляюць у трубу, таму майстры (іх прыехала трое) параілі зрабіць над ёй на страсе казырок.

*— Бывае, прыходзіцца чысціць комін і звонку, бо дымаход робяць не па прамой ад печы, а выводзяць убок, ствараючы такім чынам дадатковы вузел, які нагадвае прыступку. І якраз у гэтым месцы дымаход часта забіваецца,* — дадае Саша. — *На наяўнасць птушыных гнёздаў на вока не праверыш. Трэба са страхі ёршык апускаць праз трубу.*

### ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ — ЦЯПЛО, ДЛЯ ШЭРШНЯЎ І ПТУШАК — ЖЫТЛО

У печах, якія будаваліся даўней, не заўжды ёсць нават ачышчальныя адтуліны — невялікія лючкі, праз якія можна выграбці сажу і рабіць якія варта на кутах печы, дзе праходзяць каналы. Раней людзі на іх эканомілі. Каб пачысціць такую канструкцыю, даводзіцца вымаць кафліну ці цагліну проста з боку печы. Нават юшкі тады былі не ва ўсіх — закрывалі дымаход, хто чым мог. Цяпер кафляй печы абкладваюць рэдка, бо сучасныя цагліны і так прыгожа выглядаюць, а награецца такая печ хутчэй, тлумачаць камінары:

*— Гаспадарам варта самім перад кожным ацяпляльным сезонам адчыняць гэтыя лючкі і выграбаць з іх попел, каб зменшыць колькасць сажы, асабліва калі ў печы вузкія каналы і вы паліце яе брыкетам. Увогуле, за станам печы трэба сачыць, а комін — абавязкова бяліць. Калі канструкцыя пачынае дыміць, на белым застаюцца цёмныя плямы, значыць, шчыліна ёсць — трэба ратаваць. Асабліва варта быць пільнымі, калі ў хаце дзве печы, аб'яднаныя ў адзін дымаход,* — раіць Саша. — *Калі цяга ў печы добрая, то ў комін могуць паляцець іскры, якія ў літаральным сэнсе вылецяць у трубу. Аднак па дарозе яны могуць запаліць сажу.*

Камінары жартуюць, што часта выконваюць работу ратавальнікаў, калі прыязджаюць чысціць комін, а там — гняздо шэршняў у дымаходзе.

*— Уяўляеце, што будзе, калі ў такой печы запаліць? Як свечка зоймецца! Вось і даводзіцца нам ад іх пазбаўляцца, бо выселіць насякомых не можа нават участковы,* — смяюцца яны. — *Часам і птушкі гнёзды ў дымаходзе робяць, так што не сумна.*

Хлопцы кажуць, што работа ім падабаецца.

*— Ты паўсюдна ездзіш, сустракаешся з новымі людзьмі, бачыш, як яны жывуць, як паміж сабой камунікуюць. Штораз заўважаем нешта новае,* — тлумачыць Ян.

Сёлета яны плануюць пашырыць фронт работ ужо на ўсю Беларусь. Яно і не дзіва: камінары — спецыялісты штучныя. На ўсю краіну хіба пару дзясяткаў набярэцца тых, хто і печ складзе, і пасля чысціць яе будзе. Печнікі найчасцей робяць толькі сваю справу, а абслугоўванне — не іх турбота, гавораць хлопцы.

Камінарамі яны сталі, лічы, выпадкова. Проста адзін з сяброў пазваніў па аб'яве ў пошуках работы, а пасля і астатнія падцягнуліся. Вучыліся справе літаральна на печках: глядзелі, слухалі, шукалі інфармацыю ў інтэрнэце. Ян па адукацыі, між іншым, аграном, а Саша — будаўнік, і паміж сабой яны браты.

### «ЗІМНІК», ГАЗЕТА І КАФЛЯ

Пакуль камінары чысцілі ды грукалі, з печы то кавалак цэглы выскокваў, то шкловаты шматок...

*— Колькі ў вас «дабра» ўсялякага тут,* — прыгаворвалі майстры, з сілай прасоўваючы ёршык усё далей па ўнутраным лабірынце печы. — *І гэта толькі ў каналах, а не ў самой печы.*

Карацей, генеральную ўборку «сэрца дома» майстры зрабілі цалкам: пачысцілі і коміны, і абедзве печы. Хлопцы, дарэчы, прыехалі з прамысловым пыласосам, так што пасля работы ў хаце дым каромыслам не стаяў. Хоць бруду назбіралася паўтара вядра, але гэта, кажуць яны, зусім не шмат.

*— Наш рэкорд па брудзе з адной печы — два мяхі з-пад цукру,* — гаворыць Ян. — *Там столькі ўсяго было, нават венік у дымаходзе!.. А самае крыўднае, што гэту печ налета гаспадары збіраліся перарабляць, і проста чысцілі перад зімой, бо бабулі было холадна ў хаце.*



Чым таўсцейшы слой попелу, што асядае на сценках каналаў, тым сапраўды марудней награецца печ. А ў пачышчаным дымаходзе цяга большая, і, адпаведна, тэмпература, значыць, цагліны ў печы хутчэй награюцца і аддаюць цяпло ў памяшканне, тлумачаць майстры. Каб давесці адну печ да ладу, ім трэба гадзіна-паўтары.

А вось правяраюць вынік сваёй працы камінары... з дапамогай газеты. Аказваецца, у яе настолькі вялікія цеплавыя здольнасці, што яна імгненна награвае паветра ў грубцы. Калі спаліць у печы дзве-тры штукі, паветра ўнутры адразу стане такім гарачым, што руку не ўсунеш.

*— Цягне добра — значыць, каналы чыстыя, прагрэліся. Толькі попел пазней дастанеце, як астыне, бо ён зараз як вугалле. А спаліў ж толькі некалькі газет,* — канстатуе Павел, які праграваe такім чынам каналы ў печы і сочыць, як паводзіць сябе агонь. — *Цяпер яшчэ праверым, як «зімнік» працуе.*

«Зімнік» — гэта ляжанка, ад якой я не наважылася адмовіцца, калі перараблялі печ, робячы яе фактычна плітой на дровах. Затое кафля на ляжанцы награваецца, і на ёй цёпла ды ўтульна. Апошнія два месяцы мама падсушвае на ёй дровы, перад тым як падпальваць печ, бо заказанае ў лістападзе паліва аказалася проста «сыромляй», і каб прапаліць хату, дроў трэба ўтрая больш, чым звычайна. Так што на ўласным досведзе пераканаліся, што дровы трэба рыхтаваць усё ж летам.

У другой печы ў нас якраз не зроблены лючкі, таму камінарам прыйшлося вымаць кафліну і праз гэтую адтуліну чысціць каналы. На такія выпадкі майстры возяць з сабой і цэглу, і запасныя цагліны, і кафліны. Пасля чысткі не толькі ўсё назад вярнулі, але яшчэ і вакол дзвярэй грубкі швы цэглай прамазалі. Яны з часам трэскаюцца, бо праз высокую тэмпературу моцна награваецца і пашыраецца метал дзверцаў. З такіх расколін таксама можа ісці дым на хату, таму за станам вакол дзвярэй топкі варта сачыць. Можна, дарэчы, замазваць іх не глінай, а сучаснымі тэрмаўстойлівымі замазкамі, хоць гліна ўжо праверана часам.

Працу камінараў мама ўжо ацаніла. Печ цяпер награваецца хутчэй, і дымам не капрызіць.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Здарэнні

# ВУГЛІ ВЫПАЛІ З ПЕЧЫ...

**У Смаргонскім раёне пры пажары ў прыватным доме загінула 101-гадовая жанчына, паведамілі ў Гродзенскім абласным упраўленні МНС.**

Уначы 13 студзеня работніца чыгуначнай станцыі звярнула ўвагу на клубы дыму ў аграгарадку Залессе. Яна паведаміла аб пажары ратавальнікам і паспяшалася на дапамогу.

«Жанчына і аднавяскоўец выбілі дзверы палаючага жылля, убачылі гаспадыню, якая ляжала на падлозе ў калідоры, і вынеслі яе на свежае паветра. Урач брыгады хуткай медыцынскай дапамогі канстатаваў смерць 101-гадовай жанчыны», — раскажалі ў МНС.

Падраздзяленні МНС ліквідавалі адкрытае гарэнне драўлянага жылля. Пажарам знішчаны дах, перакрыцце, пашкоджана маёмасць і сцены жылля. Меркаваная прычына пажару — выпадзенне вуглёў з печы.

Высветлілася, што жанчына жыла адна. Штодня да яе заходзіў пляменнік і аказваў дапамогу па хаце.

«У маразы павялічваецца колькасць так званых пячных пажараў. Таму нагадваем, што паліць у печы рэкамендуецца два-тры разы на дзень не больш як па паўтары гадзіны. Гэта дасць магчымасць пазбегнуць яе перакалу. Абавязкова кантралюйце працэс да поўнага згарання дроў», — нагадалі ў МНС.

Ратавальнікі таксама раяць удзяляць увагу сваякам і знаёмым, якія з-за ўзросту або фізічных асаблівасцяў не ў стане паклапаціцца аб уласнай бяспецы.

# «ПРАЦАВАЦЬ «24/7» НЕСКЛАДАНА, КАЛІ РАБОТА ЦІКАВАЯ»

## Бажэна Ярэміч пераканана, што поспех прыходзіць толькі да мэтанакіраваных, а ўласны стыль важнейшы за любыя трэнды

**З кіраўніком найстарэйшай у Беларусі і найбольш вядомай мадэльнай школы з уласным мадэльным агенцтвам размаўляем аб тым, ці лёгка быць дырэктарам у 22 гады, аб блізкім юбілеі Нацыянальнай школы прыгажосці, новых праектах і складніках поспеху.**



### «МАЯ РУХАЛЬНАЯ СІЛА — ЦІКАВАСЦЬ»

***— Бажэна Віктараўна, калі вам прапанавалі ўзначаліць такую сур'ёзную структуру, як Нацыянальная школа прыгажосці, ці быў момант няўпэўненасці, сумневаў?***

— Так, хвалявалася, што магу не справіцца. Дырэктар у адказе за свой калектыў — а ў Нацыянальнай школе прыгажосці гэта амаль 50 чалавек. Плюс педагогі, якія выкладаюць па дагаворах падраду. Усё гэта творчыя людзі, рознага ўзросту і з рознымі характарамі. І як кіраўнік я за кожнага з іх адказваю — за ўзровень іх дабрабыту, за камфортную псіхалагічную атмасферу, у якой яны павінны працаваць. Ад рашэнняў кіраўніка залежаць і лёс школы, і лёсы людзей — гэты момант хваляваў мяне больш за ўсё. Акрамя таго, Нацыянальная школа прыгажосці выбудоўвае партнёрскія адносіны з многімі сур'ёзнымі структурамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі — а значыць, дырэктар павінен валодаць высокім узроўнем эканамічных і юрыдычных ведаў. Я разумела: важна, каб ні майго маладога для кіраўніка ўзросту, ні майго пакуль недастатковага вопыту ніхто не адчуў. І яшчэ я не была ўпэўнена, што калектыў мяне прыме — зноў жа, з-за майго ўзросту. Не ведала, як на маё прызначэнне адрэагуюць людзі. Але калектыў прыняў вельмі добра, мы хутка наладзілі працоўны працэс і нават, можна сказаць, пасябравалі.

***— На ваш погляд, што дапамагае дасягненню поспеху ў прафесіі і кар'еры? Што павінна быць перш за ўсё: мэтанакіраванасць, вера ў сябе, уменне не баяцца адказнасці і працаваць 24 гадзіны ў суткі?***

— Мой асабісты сакрэт поспеху ў любой справе, які адкрыла для сябе яшчэ ў дзяцінстве, — гэта ўменне вучыцца. Я заўсёды шмат вучылася, шмат працавала і імкнулася развівацца. Мне важна, каб кожная хвіліна жыцця была праведзена з карысцю. Яшчэ са старшых класаў, не кажучы ўжо пра студэнцкія гады, паралельна вывучала замежныя мовы, наведвала мноства розных курсаў, не звязаных, дарэчы, з б'юці-сферай. Праўда, я ўдзельнічала ў конкурсах прыгажосці, але з мадэльным бізнесам да нядаўняга часу не сутыкалася. Так што тут мне яшчэ шмат чаму давядзіцца вучыцца. Але гэта добра: я люблю пазнаваць новае і заўсёды хацела прыносіць карысць сваёй краіне, грамадству, людзям. Безумоўна, для поспеху вельмі важная мэтанакіраванасць — калі чалавек ведае, чаго хоча, і ў яго ёсць план на перспектыву, на найбліжэйшыя 5–10 гадоў. Тады вашы планы абавязкова рэалізуюцца. Можа, не зусім так, як вы бачылі гэта першапачаткова. Але жыццё, або Бог (я веруючы чалавек), заўсёды дапамагае тым, хто сам імкнецца да сваіх мэт. Зразумела, канкрэтнай мэты стаць дырэктарам Нацыянальнай школы прыгажосці я перад сабой не ставіла, хоць мне заўсёды была цікавая б'юці-сфера. Гэтак жа, як навуковыя і практычныя аспекты юрыспрудэнцыі (па адукацыі я юрыст, скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт і зараз займаюся ў тым ліку навукай). Мне вельмі многае цікава, мая рухальная сіла па жыцці — цікавасць. І ў Нацыянальнай школе прыгажосці я змагла злучыць усе свае інтарэсы ў адзінае цэлае. Лічыцца, што для прафесійных дасягненняў і кар'ернага росту трэба ўмець працаваць «24/7», і гэта так. І не так складана, калі вам цікава.

Яшчэ адна, як мне здаецца, ключавая якасць для дасягнення поспеху ў жыцці — уменне ніколі не здавацца. Так мяне выхоўвалі бацькі. Я стараюся ставіць высокую планку і рабіць усё магчымае, каб дасягнуць пастаўленых мэт. Каб потым я магла шчыра сказаць самой сабе: зрабіла ўсё магчымае. Калі сказаць гэтага аб'ектыўна ты не можаш — значыць, не дапрацавала. І ніякія нешанцаванне або збег абставінаў тут ні пры чым.

***— Вы былі самым маладым удзельнікам дзяржаўнай камісіі, якая працавала над падрыхтоўкай праекта новай рэдакцыі Канстытуцыі. Раскажыце, калі ласка, аб вашай рабоце ў Канстытуцыйнай камісіі — наколькі складаным для вас быў гэты жыццёвы этап?***

— Гэта велізарная адказнасць, і, зразумела, я гэта ўсведамляла. Спачатку, даведаўшыся аб тым, што ўвайшла ў склад Канстытуцыйнай камісіі, я (можа быць, з прычыны ўзросту) адчула гонар. Але потым гэта «Вау!» змянілася разуменнем: усё, што камісія, і я ў тым ліку, унясе ў гэты дакумент, паўплывае на жыццё грамадства і на будучыню краіны. Канстытуцыя — Асноўны Закон дзяржавы, ён прымаецца не на год і не на два, а на вельмі доўгачасовую перспектыву. Ён вызначае і лёс краіны, і лёс людзей. Адчуваць такую адказнасць, прызнаюся, няпроста. Але без гэтага ўсведамлення працаваць над такім дакументам нельга. Калі праходзілі пасяджэнні, кожны член Канстытуцыйнай камісіі выказваў сваё меркаванне па кожным артыкуле, папраўцы, слову. Не было такога, каб хтосьці сядзеў, маўчаў, ківаў галавой. Ты павінен выказацца і пацвердзіць сваё меркаванне юрыдычна выверанай аргументацыяй — гэта значыць, удзел у кожным пасяджэнні патрабаваў высокага ўзроўню падрыхтоўкі. Акрамя таго, кожны павінен быў данесці да камісіі меркаванне тых людзей, якія за ім стаяць. За мной стаяла пэўнае маладзёжнае асяроддзе — моладзь БРСМ, іншыя маладыя людзі, якія выказваліся на дыялогавых пляцоўках. І я абавязана была данесці іх меркаванне да членаў камісіі, зрабіць так, каб выказаныя імі прапановы былі прыняты да ўвагі.

### «АМАЛЬ ЗАЎСЁДЫ ХАДЖУ НА АБЦАСАХ»

***— Гэты год для Нацыянальнай школы прыгажосці юбілейны — установе спаўняецца 25 гадоў. Раскажыце аб новых праектах, якія будуць рэалізаваны, і ў цэлым аб тых напрамках, у якіх будзе развівацца школа прыгажосці.***

— Самая першая ідэя, якую я пачала рэалізоўваць адразу, прыйшоўшы на гэтую пасаду, — стварыць прадстаўніцтвы Нацыянальнай школы прыгажосці ў рэгіёнах. Справа ў тым, што да нас паступае вельмі шмат званкоў: людзі кажуць, што хочуць вучыцца мадэлінгу і асновам стылю, удзельнічаць у фэшнмерапрыемствах і быць датычнымі да ўсяго, што робіць школа прыгажосці. Але пакуль гэтая работа вядзецца толькі ў Мінску. Таму мы вырашылі пашырацца. І ужо ў красавіку будзе адкрыта першае аддзяленне Нацыянальнай школы прыгажосці ў г. п. Воранава маёй роднай Гродзенскай вобласці. Гэты першы крок пакажа, наколькі праект будзе працаваць з эканамічнага пункту гледжання, ці будзе дастатковая цікавасць у людзей і наколькі актыўна мы здольны развіваць такія аддзяленні ў далейшым. Нацыянальная школа прыгажосці — гэта, зразумела, пэўны ўзровень і статус, таму мы дэталёва прадумалі ўсе пытанні, звязаныя з падборам выкладчыкаў у рэгіёнах, іх стажыроўкай у Нацыянальнай школе прыгажосці у Мінску і нашым куратарствам рэгіянальных аддзяленняў.

Яшчэ адзін найважнейшы кірунак работы школы на найбліжэйшую перспектыву — дабрачынныя праекты. Гэты напрамак асабліва важны асабіста для мяне. Я займалася валанцёрствам яшчэ ва ўніверсітэце і перакананa: мы павінны рабіць усё, што можам, для людзей, якім па нейкіх прычынах зараз больш складана, чым нам. Напрыклад, сумесна з БРСМ мы прыступаем да рэалізацыі інклюзіўнага праекта для дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Выхаванцы карэкцыйных цэнтраў Гродзеншчыны і Мінска прымуць удзел у нашым модным паказе. Спецыяльна для іх цяпер дызайнеры ствараюць калекцыі. Гэта малыя і падлеткі з захворваннямі апорна-рухальнага апарату, парушэннямі слыху і зроку, захворваннямі аўтычнага спектра. Наша мэта — паказаць, што такія дзеці нічым не адрозніваюцца ад сваіх аднагодкаў, у іх тыя ж мары і жаданні, яны таксама адчуваюць атмасферу свята і маюць патрэбу ў радасці і станоўчых эмоцыях.

Трэці найважнейшы для Нацыянальнай школы прыгажосці напрамак — міжнароднае супрацоўніцтва. Зараз мы рэалізоўваем праект з італьянскімі дызайнерамі, пашыраем узаемадзеянне з расійскімі партнёрамі, вядуцца перагаворы з латвійскім мадэльным агенцтвам. Нам ёсць з чым выходзіць на міжнародную арэну, Беларусь можа ганарыцца і сваімі дызайнерамі, і прыгажосцю дзяўчат-мадэляў.

***— Тады асабістае пытанне: творчасць якіх беларускіх дызайнераў блізкая непасрэдна вам?***

— Калі казаць аб аксесуарах, я прыхільніца беларускага брэнда Makey. У мяне практычна ўсё, што датычыцца сумак і галантарэі, ад гэтага брэнда. Люблю брэнд адзення «Ежевика», падабаецца тое, што робіць брэнд Garsonnier. Мне па душы і Elema, і калекцыі Цэнтра моды, але часам я апранаюся і ў масмаркеце. Дызайнерскія сукенкі абіраю толькі на вельмі статусныя мерапрыемствы. Напрыклад, цяпер з нашым мастаком-стылістам, дызайнерам Надзеяй Лунёвай буду шыць сабе сукенку для ўрачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных 25-годдзю школы прыгажосці. А ў паўсядзённым жыцці, перакананa, стыльна выглядаць — гэта не заўсёды пра цану адзення. Хутчэй пра ўласны стыль. Ён павінен быць сугучны вашаму ўнутранаму «Я», ісці ад душы. Напрыклад, мяне цяжка пераапрануць у спартыўнае. Я аддаю перавагу дзелавому стылю. І амаль заўсёды хаджу на абцасах. Не трэба падладжвацца пад трэнды — яны далёка не ўсім да твару.



### «ПРЫГАЖОСЦЬ — ГЭТА НЕ ПРА ЎЗРОСТ»

***— Школа прыгажосці працуе з зусім юнымі будучымі мадэлямі. Што яна можа даць дзіцяці? Многія бацькі з асцярогай ставяцца да дзіцячага мадэлінгу, лічачы, што настолькі канкурэнтнае асяроддзе можа пашкодзіць дзіцячай псіхіцы...***

— Самым малодшым нашым вучням тры гады. Але вучоба ў нас не абмяжоўваецца толькі навучаннем прыгожа хадзіць па подыуме. У школе прыгажосці выкладаюцца многія дысцыпліны (зразумела, для малых — у лайт-варыянце). Акрамя дэфіле, гэта і асновы макіяжу, і асновы стылю, і культура харчавання, і этыкет. Хваляванні бацькоў зразумелыя, але ў нас няма ніякага ціску: мы не ствараем канкурэнцыі паміж дзецьмі. Наадварот, стараемся з'яднаць дзіцячыя групы ў адзіны калектыў, развіць у дзяўчынках якасці сапраўднай лэдзі, а ў хлопчыках — мужнасць. Ужо ў далейшым, калі нашы вучні, пасталеўшы, становяцца прафесійнымі мадэлямі, яны, безумоўна, сутыкаюцца з канкурэнцыяй. Мадэлінг, сапраўды, — вельмі канкурэнтнае асяроддзе, але канкурэнцыя ёсць усюды. У любой сферы дзейнасці трэба быць гатовым, што хтосьці будзе лепшы за цябе, трэба развівацца і працаваць над сабой. Мне здаецца, разуменне гэтай ісціны выхоўвае характар і робіць чалавека больш адаптаваным да жыцця.

***— Ёсць у Нацыянальнай школе прыгажосці і групы для жанчын і мужчын старшай узроставай катэгорыі. Чаму галоўнаму вы як кіраўнік школы хацелі б навучыць беларускіх жанчын больш сталага ўзросту?***

— Шчыра кажучы, я не адчуваю, што маю права некага вучыць: мне самой яшчэ шмат чаму трэба вучыцца. Ну, а калі казаць пра тое, што мне хацелася б данесці да нашых цудоўных жанчын старэйшага ўзросту... Перш за ўсё, ідэя стварэння «дарослых» груп з'явілася, калі мамы і бабулі нашых вучняў сталі звяртацца па параду да выкладчыкаў. Аказалася, далёка не ўсе жанчыны ўмеюць наносіць макіяж, рабіць прычоскі, не кажучы ўжо пра ўласны стыль. І многія хочуць навучыцца. А мы маем магчымасць даць ім гэтыя веды. Плюс удзел нашых вучняў старэйшага ўзросту ў модных паказах — гэта вельмі важная, на мой погляд, праца (у тым ліку і калі ўзяць псіхалагічны аспект). Беларускам сталага ўзросту часам не хапае разняволенасці, усведамлення, якія яны прыгажуні. Затое ёсць стэрэатып, што мама павінна-павінна-павінна сваёй сям'і і сваім дзецям. Але дзеці вырастаюць, з выхадам на пенсію прафесійныя задачы застаюцца ў мінулым — і... жанчыне здаецца, што жыццё скончана. Між тым на самай справе менавіта гэты перыяд трэба прысвяціць сабе любімай. У мяне перад вачыма ёсць цудоўны прыклад — вучаніца Нацыянальнай школы прыгажосці, адна з самых старэйшых мадэляў Беларусі. Ёй за 70, але яна выглядае неперадавальна: стыльная і яркая, на яе хочацца арыентавацца. Не трэба баяцца «апранацца не па ўзросце», не трэба забываць пра сябе, таму што «гады бяруць сваё». Кожная з нас можа і павінна быць прыгожай у любым узросце. Гэта я і хачу данесці да нашых жанчын.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

## Уладзімір СЛАБОДЧЫКАЎ:

# «Калі лічыш сябе беларускім мастаком, то трэба ведаць гісторыю сваёй краіны»



Фота БелТА

**Вядомы беларускі скульптар, загадчык кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, уладальнік шматлікіх узнагарод Уладзімір Слабодчыкаў у мінулым годзе атрымаў яшчэ дзве знакавыя ўзнагароды — плацінавы медаль ад Французскага акадэмічнага таварыства мастацтва, навук і літаратуры і званне «Народны мастак Беларусі». Уладзімір Іванавіч больш за 30 гадоў працуе ў акадэміі, за гэты час падрыхтаваў мноства таленавітых мастакоў. Наша сустрэча з ім прайшла ў яго майстэрні, дзе скульптар паказаў свае работы. Мы пагутарылі пра сучаснае мастацтва, настаўніцтва, пра тое, як знайсці сваё месца ў творчасці і пра многае іншае.**

***— Раскажыце, калі ласка, пра ваш шлях да настаўніцтва?***

— Я нарадзіўся ў сям'і сельскіх настаўнікаў. Толькі надыходзіў вучэбны год — бацькі расказвалі пра школьнікаў, пра тое, якія ўрокі будуць весці. І я, як усе дзеці, убіраў усё, што казалі дарослыя, няхай і несвядома. На 6-м курсе інстытута мяне запрасілі выкладаць у гімназію-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка. Адпрацаваў паўгода, а потым, пасля заканчэння інстытута, мяне туды адправілі настаўнікам, і я застаўся амаль на 15 гадоў у гэтай самай вядомай школе па падрыхтоўцы мастакоў і музыкаў.

***— Ці запатрабавана сёння прафесія скульптара, ці шмат абітурыентаў паступае?***

— Скульптура запатрабавана. Пастаянна ствараюцца скульптурныя кампазіцыі, помнікі, асабліва шмат вобразаў гістарычнага кірунку — таму што мы ўвесь час адкрываем нашы мінулае, гісторыю. Таму важнай для сябе лічу колішнюю працу над скульптурай мастака Ваньковіча. У апошнія гады конкурс на спецыяльнасць ёсць, тым больш усяго ў нас шэсць бюджэтных месцаў. Няшмат, але для нашай невялікай краіны гэтага дастаткова.

***— Як пасля ўладкоўваюцца студэнты?***

— Яны абавязаны адпрацаваць два гады пасля заканчэння акадэміі. Пошук размеркавання кладзецца на загадчыка кафедры і на педагогаў. Асноўная маса хоча застацца ў Мінску, і, вядома, гэта праблема. Таму што Мінск у нейкай меры хапае кіпучага мастацкага жыцця, а правінцыя пакутуе ад недахопу скульптараў. Амаль усе нашы выпускнікі пасля размеркавання працуюць па спецыяльнасці. Але варта памятаць: паступленне не гарантуе, што ты будзеш да канца жыцця займацца скульптурай, гэта толькі пачатковая форма ўваходжання ў жыццё мастака. Складана знайсці сябе ў мастацтве. Але я вельмі рады, што ў краіне ёсць акадэмія — людзі мастацтва ствараюць прыгожае, робяць наша жыццё больш эмацыянальным, разнастайным. А хто будзе мастаком вялікім ці малым — не так важна.

***— Ці заўсёды хапае густу маладым, якія выраслі ў эпоху масавага мастацтва?***

— Думаю, галоўная задача мастацкай школы — фарміраванне густу. Таму што можна навучыць тэхнічным дзеянням — маляваць, ляпіць, пісаць фарбамі, але калі няма сфарміраванага густу, то, вядома, гэта бескарысна. Падчас заняткаў са студэнтамі мы пастаянна гаворым аб работах мастакоў, аб сучаснай скульптуры, аб тым, як адрозніць банальнасць ад геніяльнасці, знайсці штампы. Калі я вучыўся ў інстытуце — былі толькі кнігі па гісторыі мастацтваў, дакументальныя фільмы і наведванне музеяў. Цяпер ёсць інтэрнэт, шмат даступнай інфармацыі, больш магчымасцяў развіць густ.

***— Як прывіць студэнту любоў да беларускай культуры? Бо праз работы скульптараў пасля будуць транслявацца нейкія культурныя кадры.***

— Сапраўдны мастак не можа ствараць работы за межамі сваёй культуры, таму што ён вырас у гэтым. Толькі трэба ўмець адчуць, убачыць свет праз прызму народнага мастацтва. Армянскі мастак Сар'ян пісаў такімі фарбамі, якія, напрыклад, беларускі мастак не выкарыстаў бы. Таму што яго атачаў зусім іншы пейзаж. Абраныя ім фарбы, каларыт — гэта армянская гама. У нас іншая гама — больш спакойныя пейзажы і колеравыя рашэнні, гэта, напрыклад, відаць па жывапісе Бяльніцкага-Бірулі. Я думаю, што паступова, у працэсе развіцця мастака, гэты культурны пласт пераходзіць у падсвядомасць. Калі лічыш сябе беларускім мастаком, то трэба ведаць гісторыю сваёй краіны, трэба прапаноўваць яе гледачу. Мы абавязаны пакінуць след у сябе дома, вывучаючы і прапагандуючы беларускае мастацтва.

***— Як узяліся за праект «Памінальны вянок» у Равенсбруку, чым натхняліся?***



— Гэта мемарыяльны знак у памяць аб жаночым канцлагеры, дзе загінула больш за 2000 жанчын з Беларусі. Не хацелася рабіць банальны варыянт, таму было прыдумана канстатаваць гэтую трагедыю праз цярновы вянок. Скульптура складаецца з паловы цярновага вянка і паловы вянка, сплеценага з агаленых жаночых целаў. Цярновы вянок азначае трагедыю, боль, прыніжэнне... Жаночае цела — сімвал жыцця, але яно нібыта ахоплена полымем.

***— Ці часта бывае, што нехта пачынае як мастак, а пасля займаецца скульптурай, і наадварот? Як мы памятаем, Васіль Быкаў, напрыклад, скончыў аддзяленне скульптуры, а потым стаў пісьменнікам.***

— Прыкладаў шмат, дапусцім, Віктар Шматаў: ён быў жывапісцам, але потым стаў займацца мастацтвазнаўствам. Адам Глобус, які пачынаў як мастак, а цяпер яшчэ і пісьменнік. Я вельмі люблю чытаць лісты Рэпіна, Несцерава, успаміны Каровіна, напісана вельмі цікава, таленавіта. Думаю, калі ў мастака адабраць фарбы — ён прыдумае, як яшчэ знайсці сябе ў творчасці.

***— А з чаго наогул пачаўся ваш шлях скульптара? Якая была ваша першая работа?***

— Мой бацька добра рабіў копіі карцін, напрыклад, «Раніца ў сасновым бары», «Тры багатыры», «Партрэт Пушкіна». А яшчэ ў 1-2 класах настаўнік сказаў, што мне трэба звярнуць увагу на мастацтва. І я памятаю, як упершыню ўзяў у рукі пластылін, мне так падабалася, у мяне ўсё атрымлівалася. Зараз успамінаю сваю першую працу ў інстытуце... Я ж не атрымаў класічнай адукацыі, не быў у спецыяльным вучылішчы. Я просты хлопец з вясковай школы, і ў мяне атрымалася паступіць. Дык вось, мая першая работа ў інстытуце — «Дон Кіхот». У нас была практыка, 3 курс, ліццё ў метале. Атрымалася так, што мой «Дон Кіхот» вельмі спадабаўся выкладчыкам кафедры, пайшоў у фонд нашай акадэміі, а потым я зрабіў копію — гіпсавая скульптура засталася ў акадэміі, а сабе я ўзяў бронзавую. І бронзавая трапіла на выставу ў Польшчы, гэта былі 70-я гады. На той момант такое было неймаверна — каб студэнцкая работа трапіла туды! А потым, пасля заканчэння інстытута, група мастацтвазнаўцаў з Траццякоўскай галерэі наведала маю майстэрню, работа ім так спадабалася, што яны яе прапанавалі закупіць для Траццякоўкі. Зразумейце, для мастака вельмі важна, калі скульптуры трапляюць у калекцыі музеяў, у гэты момант мастак набывае ўжо іншы статус. Мне было 26–27 гадоў, калі мая работа была ўжо ў Траццякоўскай галерэі, а я яе зрабіў, калі мне было 18—19 гадоў. Я часта прыводжу гэты прыклад студэнтам, таму што варта заўсёды верыць у сябе.

***— Што трэба, каб быць мастаком?***

— Вялікая любоў да мастацтва, веды. Калі Бог даў дар — можна гэты дар удасканальваць, а можна страціць. Дапамагаць дар будзе толькі тым, хто працуе. І, вядома, мастаку патрэбны сумневы. Сумневы — рухавік прагрэсу. Калі чалавек упэўнены — ён непахісны, думае, што ўсё ведае. Гэта няправільна. Сумневы заўсёды спараджаюць розныя выхады з праблем.

***— Ці ёсць у вас любімая праца, якую вы назвалі б працай усяго жыцця?***

— Дапусцім, у вас пяць дзяцей, якое дзіця самае лепшае, каго вы больш любіце? Такога няма. Мне здаецца, шчасце — гэта калі ў цябе няма любімчыкаў, бо іншыя пакрыўдзяцца! Я стараюся аддаваць усё, што ў мяне ёсць, кожнай рабоце.

***— Адна з цэнтральных тэм вашай творчасці — «Чалавек як філасофская катэгорыя». Чаму?***

— Я люблю ляпіць не проста рэальны вобраз чалавека, фатаграфічны. Мяне цікавіць унутраны свет. Бо чалавек разнастайны, ён згустак эмоцый, ведаў, магчымасцяў. Да таго ж я задаюся мноствам пытанняў. Хто мы? Што мы робім у гэтым свеце? Для чаго мы тут? Хто нас сюды закінуў? Якая наша функцыя? Куды мы рухаемся і навошта? І ў мастацтва ёсць адказы. І яны даволі відавочныя. Думаю, раней мастацтва было лепшым, чым тое, што мы маем цяпер. Можа, паступова мы становімся робатамі, губляем адчуванне прыгожага, эмацыянальнага, прыходзім да правільнага, тэхнічнага, матэматычнага мыслення. Я разумею чалавека як Космас. Як сувязь паміж зямным і нябесным. Таму мае скульптуры маюць выцягнутыя формы. Трэба ісці далей акадэмічнай адукацыі.

***— Пішуць, што ўлюбёным вашым матэрыялам з'яўляецца бронза...***

— Я люблю розныя матэрыялы, напрыклад, алюміній. Мала хто з ім працуе, я яго знайшоў, адкрыў для сябе, гэта вельмі прыгожы матэрыял, у алюмініі адчуваецца нешта касмічнае.

***— У чым заключаюцца праблемы сучаснага мастацтва?***

— Сучаснае мастацтва пакутуе ад несвабоды выяўлення, гэта адчуваецца ўсюды: ёсць зашоранасць, штампы. Здавалася б, цяпер шмат свабоды, але гэта не так. Куды ні глянь — усюды гэтая праблема. Выдатна, калі мастак можа выказаць тое, што ён хоча. Але ў нас спрацоўвае самакантроль: гэтага не зразумеюць, а ад гэтага падумаюць, што я звар'яцеў. І такія моманты вельмі абмяжоўваюць. Але праблема яшчэ ў самавыяўленні, паступова сыходзіць сама школа, веданне формы, цяпер людзей больш цікавіць канцэптуальнае, ва ўсіх напрамках ідзе канкурэнцыя ідэй. Акцыянізм, перформансы — гэта ўсё працуе на ідэю.

***— Можаце распавесці якую-небудзь цікавую гісторыю, звязаную са стварэннем скульптуры?***

— Напрыклад, «звон» для Светлагорска. Ён вялікі, патрэбна была бронза, а ў горадзе меўся фігуратыўны помнік, які ў свой час не паставілі, так што... пераплавілі тую скульптуру для маёй работы. Бронза ўсё вытрымае *(смяецца)*. Яшчэ цікава, калі везлі гэты «звон» на платформе — ён зачапіўся за правады каля стадыёна «Дынама», ніяк не маглі яго перасунуць, а трэба было тэрмінова везці, таму што ў Светлагорску ўжо ўсе чакалі. У выніку прыехала міліцыя, пачалі разблытваць гэты «звон»... Уявіце, работа едзе на платформе, усе глядзяць на скульптуру, а нас міліцыя вядзе. Мінск заканчваецца, нас перадаюць абласной міліцыі, потым суправаджае гомельская міліцыя... Такая доўгая працэсія, гэта было незвычайна. Адкрыццё помніка — заўсёды прыемна і хвалююча.

***— Чаму хвалююча?***

— Калі ты маленькую рэч узяў на выставу — можаш яе прыбраць, калі бачыш, што людзі крывяцца ці сам адчуваеш штосьці не тое. А калі паставілі помнік — гэта ўсё, яго ўжо не прыбярэш. Можна сказаць, паставіў сабе прысуд. Добры ці дрэнны — гэта як Бог дасць.

***— А ці часта вас разумеюць крытыкі?***

— Вельмі рэдка, хоць гэта прыемныя людзі, мы з многімі знаёмыя. Але ў іх аналізе сустракаюцца штампы, неглыбокае асэнсаванне, часцей за ўсё «Ах, заслужаны мастак, значыць, добра...» і г. д. Свет па вялікім рахунку банальны: я бачу неба, ты таксама бачыш неба. Але калі ў табе ёсць нешта — ты ўбачыш больш, чым іншы чалавек. І вось гэты момант «крыху больш, чым іншы», вельмі важны для сусветнага мастацтва, таму што яно ўзбагачае агульную масу поглядаў, адкрывае новае. А быць лепшым ці горшым у вачах крытыкаў — мяне гэта не цікавіць.

***— А ці бывае так, што хтосьці глядзіць на вашу работу і бачыць у ёй нешта больш, акрамя таго, што ўкладвалі вы?***

— У мяне была дыпломная работа, яе ацэньваў мастацтвазнаўца. Ён пачаў характарызаваць маю скульптуру і прывёў такія асэнсаванні, што я падумаў: «Божа мой, я, аказваецца, такі разумны! Падняў такія пласты». Было ўсцешна.

**Ангеліна ВАРАТЫНСКАЯ,**
**фота аўтара.**

# КЛІМАТ-КАНТРОЛЬ, ІНКЛЮЗІЎНАСЦЬ І ТВОРЧАЯ СТУДЫЯ:

## чым здзівіць новы корпус Нацыянальнага мастацкага музея

**У Нацыянальным мастацкім музеі адкрыўся новы выставачны корпус, у якім будуць экспанавацца толькі часовыя тэматычныя праекты. Знаходзіцца ён побач з галоўным, па адрасе Карла Маркса, 24. Экскурсію для «Звязды» правяла загадчыца сектара маркетынгу Святлана ВАРАПАЙ:**

— У новым выставачным корпусе чатыры паверхі. На першым знаходзіцца крама і кафетэрый, на другім размясціліся кабінеты навуковых супрацоўнікаў музея, відэазала і творчая студыя, якую ў далейшым плануем выкарыстоўваць для інклюзіўнай работы з дзецьмі і дарослымі. А трэці і чацвёрты паверхі адведзены пад экспазіцыі.

Ідэя стварэння музейнага комплексу ў межах аднаго квартала ў цэнтры горада з'явілася яшчэ на пачатку 2000-х. І вось паступова яна ажыццяўляецца. У планах — перабудаванне галоўнага корпуса, каб зрабіць яго яшчэ больш камфортным для наведвальнікаў.

— Мы не спыняем развіццё музея. Разам з выставачным корпусам, па вуліцы Кірава адкрыліся новыя рэстаўрацыйныя майстэрні, а таксама наша навуковая бібліятэка, — адзначыла Святлана Варапай. — Наступны этап — рэканструкцыя і аднаўленне галоўнага корпуса. Фасад застанецца такім жа пазнавальным, а ўнутраную залу музея пераробяць, каб наведвальнікам і супрацоўнікам было больш зручна. Але паўтаруся: архітэктурную ідэю будынка мы абавязкова захаваем.

Адна з галоўных пераваг новага корпуса — асвятленне і клімат-кантроль. На тых паверхах, дзе экспануюцца карціны, няма вокнаў: прыроднае святло шкодзіць мастацкім творам. Менавіта таму ў будынку ўстаноўлены спецыяльныя лямпы, якія даюць прафесійнае асвятленне. Дзякуючы ім карціны быццам свецяцца знутры, а творы, якія захоўваюцца пад шклом, не блікуюць. Святлана Варапай адзначыла, што праз новыя функцыі музеефікацыя аб'ектаў адбылася ў поўнай ступені.

Яшчэ адна адметнасць новага корпуса, якую заўважыць кожны з наведвальнікаў, — магчымасць пазнаёміцца з рэстаўрацыйным працэсам дзякуючы часовай выставе:

— Цяпер на трэцім паверсе экспануюцца выратаваныя мастацкія каштоўнасці. Гэта творы, з якімі працавалі нашы мастакі-рэстаўратары. Побач з карцінамі знаходзяцца тлумачальныя эксплікацыі. Яны дэманструюць першапачатковы стан карціны, а таксама паказваюць працэс аднаўлення твора, — распавяла Святлана Варапай.









Выставачны корпус Нацыянальнага мастацкага музея — гэта і творчая пляцоўка. У спецыяльнай студыі займаюцца школьныя групы. Майстар-класы і інтэрактыўныя заняткі праводзяць супрацоўнікі музея. Ёсць і зала з вялікім экранам, дзе будуць адбывацца адукацыйныя лекцыі і сустрэчы.

Пашырылася і крама музея. Калі раней прадукцыю можна было набыць у галоўным будынку, то цяпер наведвальнікі знойдуць спецыялізаваную літаратуру, сувенірную прадукцыю і нават адзенне і на першым паверсе новага корпуса.

Адметна, што нядаўна «Звязда» распавядала аб сацыяльна-інклюзіўным праекце «Карціны, якія ажылі». Ён дапамагае людзям з парушэннямі слыхавога апарата пазнаёміцца з творамі мастацтва. Музей працягвае ствараць зручнае асяроддзе — маламабільныя наведвальнікі могуць бесперашкодна трапіць з новага выставачнага корпуса ў галоўны праз спецыяльны калідор. А галоўны ўваход корпуса абсталяваны спецыяльным пад'ёмнікам ды ліфтам. Але гэта далёка не ўсе навеўвядзенні, якімі могуць пахваліцца супрацоўнікі.

— Цяпер наша задача — зрабіць корпус на вуліцы Карла Маркса такім жа пазнавальным, як і галоўны. Каб ён таксама асацыяваўся з Нацыянальным мастацкім музеем, — дадала Святлана Варапай.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

Таленты

# АКАЎНТ У TikTok І ГАРЫ ПОТЭР ПА-БЕЛАРУСКУ

## Як падтрымліваюць юных аўтараў

**У Доме прэсы нядаўна адбылася сустрэча, прысвечаная пытанню падтрымкі юных літаратурных талентаў. Удзельнікі распавялі аб дзяржаўных і міжнародных конкурсах, а таксама падзяліліся меркаваннямі аб тым, як дапамагчы дзецям і моладзі раскрыць свой творчы патэнцыял. Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ адзначыла, што для пісьменнікаў асабліва важна, каб у літаратуры была пераемнасць пакаленняў:**

— Мы бачым, як тэма патрыятызму вельмі хвалюе не толькі вядомых пісьменнікаў, але і юных аўтараў. Аб гэтым сведчаць тыя кнігі, якія выдаюцца ў нашай краіне. На прыкладзе конкурсу «Жывая класіка» можна ўбачыць, як дзеці ўмеюць размаўляць, аналізаваць творы і вершы менавіта на беларускай мове. І, што вельмі прыемна, з іх вуснаў мова гучыць актуальна, сучасна. Я зноў запрашаю ўсіх ахвотных да ўдзелу ў гэтым конкурсе. З новага года пачаўся чарговы творчы сезон. Таксама мне хочацца звярнуць увагу на конкурс, які праходзіць у межах Саюзнай дзяржавы. Ён мае назву «Мост сяброўства» і сёлета адбываецца ўжо пяты раз. Людзі прыязджаюць у Беларусь з розных куткоў Расіі — гэта вельмі ганарова, што нашыя таленты разам з сябрамі з Расіі на такім высокім узроўні могуць прадэманстраваць літаратурныя веды. У якасці іх падтрымкі выдаецца альманах.

Удзельнікі сустрэчы адзначылі, што моладзі неабходна своечасовая падтрымка і ўвага. І калі ў сталічных пісьменнікаў ёсць больш вялікая колькасць варыянтаў для прасоўвання сваіх твораў, то тыя, хто жывуць у невялікіх мястэчках і вёсках, могуць сутыкнуцца са складанасцямі. У дадзенай сітуацыі вырашальнай можа аказацца асоба настаўніка ці педагога, які дапаможа юнаму аўтару прасунуць свае творы ў газеты і часопісы.

— Каля дзесяці гадоў у Мінскім абласным саюзе пісьменнікаў выдаецца серыя «Мінскія маладыя галасы», — распавёў **Уладзімір МАЗГО, намеснік старшыні Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.** — Шмат з тых аўтараў, якія друкавалі творы ў гэтай серыі, ужо сталі лаўрэатамі конкурсаў. Акрамя гэтага, не так даўно праходзіў творчы конкурс, прысвечаны Максіму Багдановічу. У ім прыняло ўдзел амаль 200 юных літаратараў з усёй Беларусі. Самыя лепшыя творы рэкамендаваны да друку ў часопісе «Маладосць», спадзяюся, што для юных творцаў гэта стане пэўным стымулам.

Зразумела, што ўдзел у конкурсах — важны этап для фарміравання творчай асобы. Але не менш важна, каб творы маладых аўтараў выдаваліся. Удзел у сустрэчы прынялі і супрацоўнікі беларускіх газет і часопісаў.

— Нягледзячы на тое, што наша мэтавая аўдыторыя ўсё ж такі дарослыя людзі, маладым аўтарам, якія да нас звяртаюцца, мы аказваем першасную ўвагу, — адзначыла **Таццяна БАРАДУЛЯ, рэдактар аддзела паэзіі і крытыкі газеты «Літаратура і мастацтва».** — Увогуле, у іх работах ёсць такая асаблівасць, невераго́дная колькасць любові, аптымістычнага пазірку на жыццё — гэтым немагчыма не падзяліцца.

У сваю чаргу **рэдактар аддзела часопіса «Бярозка» Ксенія СІТНІК** дадала, што сувязь з моладдзю існуе:

— Наша работа з юнымі аўтарамі не абмяжоўваецца толькі друкаваным часопісам. Мы прэзентуем сябе ў сацыяльных сетках, з'явілася нават амбіцыйная мэта — стварыць акаўнт «Бярозкі» на платформе «TikTok», якая вельмі папулярная сярод моладзі. З юнымі аўтарамі трэба размаўляць на адной мове, быць бліжэй да іх. Таксама з гонарам хачу адзначыць яшчэ адну навіну: «Бярозка» пачынае сумесны праект з каналам «Культура» Беларускага радыё. Кожны месяц будзе выходзіць чытацкі клуб, дзе мы разам з беларускамоўнымі дзеткамі станем абмяркоўваць творы, якія іх цікавяць. У снежні выйдзе выпуск, прысвечаны кнізе «Гары Потэр і філасофскі камень» у перакладзе Алены Пятровіч.

**Арына КАРПОВІЧ.**

## Извещение о проведении **03 февраля 2022 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение (подземное битумохранилище) с инв. № 631/С-59042, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б/н составленному по состоянию на 25.05.2009 года; капитальное строение (водопроводная сеть) с инв. № 631/С-58995, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: водопроводная сеть протяженностью 175,6 м, состоящая из напорного трубопровода, колодца, артезианской скважины, водонапорной башни; капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 631/С-12108, общей площадью 308,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса, с пристройкой, асфальтно-бетонной площадкой, тремя ограждениями (с воротами и столбами); капитальное строение (гудронохранилище) с инв. № 631/С-59045, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: гудронохранилище объемом 2061 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59044, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 948 куб. м; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59043, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 648 куб. м; капитальное строение (здание весовой, проходной) с инв. № 631/С-12106, общей площадью 81,0 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой, проходной; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58979, общей площадью 110,1 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание склада с пристройкой; капитальное строение (котельная) с инв. № 631/С-12107, общей площадью 102,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной с пристройкой; капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 631/С-58986, общей площадью 57,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58980, общей площадью 65,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное здание склада; капитальное строение (компрессорная) с инв. № 631/С-58981, общей площадью 81,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание компрессорной с пристройкой, тремя емкостями; капитальное строение (электроцех) с инв. № 631/С-58982, общей площадью 39,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание электроцеха; капитальное строение (паропровод) с инв. № 631/С-58987, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной паропровод протяженностью 184,8 кв. м, состоящий из двух участков; капитальное строение (битумопровод) с инв. № 631/С-58989, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной, битумопровод диаметром 75 мм, протяженностью 201 м; капитальное строение (мазутопровод) с инв. № 631/С-58988, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б/н составленному по состоянию на 16.06.2009 года; капитальное строение (канализационная сеть) с инв. № 631/С-58990, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная канализационная сеть протяженностью 108 м, состоит из двух участков и четырех колодцев; капитальное строение (линия электропередачи) с инв. № 631/С-58992, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная линия электропередачи протяженностью 646,6 м, напряжением 04 кВ, состоящая из четырех участков; капитальное строение (линия наружного освещения) с инв. № 631/С-58993, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: линия наружного освещения протяженностью 19,7 кв. м, напряжением 0,4 кВ, способ прокладки – подземный, состоит из двух участков и двух мачт; капитальное строение (сеть газопровода) с инв. № 631/С-65180, общей площадью 259,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 23.02.2018 года б/н, составленному по состоянию на 22.02.2018 г. Молодечненским филиалом РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; узел учета газа, инвентарный номер 1372; установка докотловой обработки воды, инвентарный номер 940; резервуар Р 2500000, инвентарный номер 402; резервуар Р-25, инвентарный номер 410; емкость металлическая, инвентарный номер 201; трансформатор ТМ 630/10, инвентарный номер 678; емкости, инвентарный номер 657; емкости, инвентарный номер 658; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 670; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 671; котлоагрегат, инвентарный номер 693; котел Е 1/9, инвентарный номер 695; котел чугунный водогрейный, инвентарный номер 712; модуль подогрева топлива БСТ-МПТ-12-2, инвентарный номер 715 |
| Сведения о земельных участках:<br>площадь – 1,5355 га, кадастровый номер – 621350100001000310 |
| Площадь – 4,6829 га, кадастровый номер – 621350100004000541 |
| Местонахождение: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Волкова, 43 |
| Начальная цена: 143 494,15 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 14 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **03 февраля 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.01.2022 по 01.02.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «У Вас Двойня»

**Организатор Рекламной игры:** ООО «Атлант-М Технологии», с местом нахождения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Боровлянский сельсовет, район деревни Боровая, дом 2, офисное помещение № 11, 3-й этаж, УНП 690670985, тел.: +375296770099

**Рекламная игра называется: «У Вас Двойня».**

Срок начала и окончания Рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 31 мая 2021 г. по 21 января 2022 г.

Территория проведения Рекламной игры: интернет-магазины (Республика Беларусь) – kia.atlantm.by, vw.atlantm.by, mazda.atlantm.by, ford.atlantm.by, toyota.atlantm.by, lexus.atlantm.by, jaguar.atlantm.by, landrover.atlantm.by, geely.atlantm.by, atlantm.by.

Свидетельство № 3994 о государственной регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 15 мая 2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

В Рекламной игре приняло участие 36 (тридцать шесть) физических лиц.

Призовой фонд разыгран полностью.

**Главный приз новый автомобиль Мазда CX-30 ACTIVE P1 2,0AT FWD** стоимостью 65 860, 00 белорусских рублей и денежная сумма для уплаты подоходного налога в размере 9 818, 74 белорусских рублей (1 шт. ) **выиграла Сидоренко Виолетта Андреевна (г. Минск).**

Телефон горячей линии по вопросам проведения Рекламной игры: +375 33 333 51 05.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор** | **ИП Субботницкий И.В. – ликвидатор ООО «Кроличья хатка»** |
| **Продавец** | **ООО «Кроличья хатка», УНП 391079061** |
| **Форма аукциона** | **Торги проводятся в форме открытого аукциона** |
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **Торги проводятся 28.01.2022 года. Начало аукциона – 15.00. Место проведения: г. Минск, ул. Киселева, д. 38, помещение 11** |
| **Контактные данные** | **тел. +37529 6669171, e-mail: igor_subb@mail.ru** |
| *Сведения о предмете торгов и начальная цена, BYN.*<br>*Лот № 1. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19235. Наименование: зерносклад, назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения, общая площадь 692,8 кв. м – 29 212,00 руб.*<br>*Лот № 2. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19237. Наименование: зерноток, назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения, общая площадь 354,7 кв. м – 13 534,00 руб.*<br>*Лот № 3. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19236. Наименование: зернохранилище, назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения, общая площадь 413,3 кв. м – 15 544,00 руб.*<br>*Лот № 4. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19238. Наименование: мехмастерские, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), общая площадь 406,4 кв. м – 22 981,00 руб.*<br>*Лот № 5. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19239. Наименование: навес, назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ, общая площадь 854,1 кв. м – 25 259,00 руб.*<br>*Продавец не является плательщиком НДС* | |
| Размер задатка, шаг торгов: 5 (пять) % от начальной цены предмета торгов по каждому лоту. Задаток перечисляется на расчетный счет ООО «Кроличья хатка»:<br>УНП 391079061, р/с BY38BAPB30124922300120000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X. Сумма шага аукциона составляет 5 % от начальной цены предмета торгов | |
| Сроки и порядок приема заявок: заявления с необходимыми документами на участие в аукционе принимаются по адресу: 222304, Минская область, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, д. 3, оф. 10 или на e-mail: igor_subb@mail.ru, в рабочие дни с 09.00 до 17.00 **с 18 января 2022 года по 27 января 2022 года включительно** | |
| Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним: вышеуказанные объекты находятся на территории ООО «Кроличья хатка» по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, 3, 3/1, 3/2, 4, 4/1.<br>Ознакомиться с предметами торгов можно по месту их нахождения с 09.00 до 17.00 в рабочие дни, предварительно согласовав время с организатором торгов по тел. +375296669171 | |
| Док-ты, необходимые для участия в торгах: к участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, копию свидетельства о госрегистрации | |
| Возмещение затрат: победителем торгов (претендентом на покупку) возмещаются фактические затраты, связанные с их организацией и проведением в размере 1 % от стоимости лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов | |
| Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней после проведения аукциона | |
| Срок оплаты: не более 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | |
| В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.<br>Результаты торгов по конкретному предмету подлежат аннулированию организатором торгов в случаях, если победитель торгов уклоняется или отказывается от:<br>- подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам торгов;<br>- возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов;<br>- оплаты предмета торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов;<br>- государственной регистрации договора купли-продажи предмета торгов.<br>В случае аннулирования результатов торгов по указанным основаниям внесенный победителем торгов задаток не возвращается, а включается в состав имущества продавца | |
| В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 199 (29568) за 15.10.2021, 6 стр. | |

## ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

### по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло», опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) с дополнением от 10.08.2021 № 151 (29520), от 02.10.2021 № 190 (29559), от 27.10.2021 № 207 (29576), от 13.11.2021 № 220 (29589), от 10.12.2021 г. № 239 (29608), от 29.12.2021 № 251 (29620)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика).

**Информация о застройщике**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) следующие дополнения:

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:**

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 183 (проектный) общей площадью по проекту 67,4 кв. метров на 10-м этаже, 4 секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1700 долларов США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1800 долларов США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

## ЗАО «ЦЕНТР ПРОМЫШЛЕННОЙ ОЦЕНКИ»

**информирует о следующих изменениях в извещении по продаже имущества ОАО «Строительный трест № 13» (публикация в газете «Звязда» от 11.01.2022):**

Начальную цену и минимальную цену лотов читать как:

Лот № 1: АтомобильGAZ-330232 (рег. знак АВ 2568-6), начальная цена 2 520,00 бел. руб., минимальная цена 1 440,00 бел. руб.

Лот № 2: Автомобиль GAZ-32213 (рег. знак АА 1006-6), начальная цена 1 540,00 бел. руб., минимальная цена 880,00 бел. руб.

Лот № 3: Автомобиль ГАЗ 33104 1 (рег. знак АА 2556-6) начальная цена 2 660,00 бел. руб., минимальная цена 1 520,00 бел. руб.

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42, www.cpo.by

УНП 700016181

Новая забава

# ЯКОГА КОЛЕРУ «КОНІК»?

## Нават дарослыя пачалі аддаваць перавагу дзіцячым беларускамоўным настольным гульням

**Напружанне, якое павісла ў дзіцячым пакоі, можна было ледзь не нажом рэзаць. Перад мужам ляжала некалькі картак з намаляванымі на іх рознакаляровымі алоўкамі. Дзве дачкі 6 і 10 гадоў глядзелі на бацьку ва ўпор, здавалася, нават, не міргаючы.**
**— Тата, апошні шанц! Засяродзься! «Конік»?!**



Наталля ГАЛКО, аўтар гульняў.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Муж умольна паглядзеў на мяне. Дзяўчынкі, убачыўшы гэта, шыкнулі ў мой бок і паказалі на дзверы.

Ужо некалькі дзён запар у маіх дзяцей новая забава — настольная беларускамоўная гульня. І калі б мне яшчэ месяц таму хто-небудзь заявіў, што мая 10-гадовая дачка, якая мае ў школе праблемы па прадмеце «белмова», будзе з зачараваннем гуляць у настолку на роднай мове — не паверыла б.




Муж вывучыў беларускую мову ў школе, але амаль не практыкуе яе ў паўсядзённым жыцці, і таму для яго гульня, разлічаная на дзяцей 5+, здаецца няпростай. Ён павінен падабраць колер алоўкаў, намаляваных на картцы, да слова, якое назавуць дзеці. Змог гэта зрабіць у дачыненні да слова «рамонак». Падабраў тры колеры — белы, жоўты, зялёны — і зарабіў бал.

Калі няправільна падбярэ колеры да слова «конік», бал атрымаюць дзяўчынкі. Пасля некаторых роздумаў муж дастае картку... з карычневым алоўкам. Дзяўчынкі пераможна ўскрыкваюць:

— Конік, тата, гэта на рускай мове «кузнечик»!

Аўтар гульні, у якую гуляла мая сям'я, — **Наталля ГАЛКО.** Яна педагог і распрацоўшчык больш чым 40 развіццёвых гульняў на беларускай мове для дзяцей і дарослых. Яна тая, хто рэгулярна дапамагае праводзіць гульнятэкі на беларускай мове ў кнігарнях і бібліятэках краіны. Яна тая, хто здолела зрабіць вывучэнне роднай мовы, славутых месцаў краіны, кветак, цікавых беларускіх фразеалагізмаў цікавым і вясёлым заняткам. Са сваім праектам «Скарбонка гульняў» удзельнічала ў Рэспубліканскім конкурсе сацыяльных праектаў «Social Weekend» і выйшла ў фінал. Як так атрымалася, што яна стала папулярызаваць вывучэнне роднай мовы і чаму цікаўнасць да гэтага праекту становіцца ўсё большай?

— На самай справе гульня са мной з дзяцінства, — расказвае Наталля. — Я заўсёды любіла гуляць у настолкі, удзельнічаць у віктарынах, рабіла крыжаванкі, рэбусы, такія вось пазнавальныя гульні былі мне цікавыя. Калі я стала працаваць настаўніцай, то заўсёды прыдумвала да ўрокаў нейкія цікавыя гульні. Мне так было лягчэй выкладаць, а малым — успрымаць. Таксама я рабіла, калі перайшла працаваць у развіццёвы цэнтр для дзяцей. У прынцыпе, адзін з галоўных пасылаў педагогікі — гэта якраз вучоба праз гульню. Рабіла ўсё матэрыялы і гульні для заняткаў уручную: выразала, клеіла, малявала... Дзеці добра ўспрымалі такі фармат навучання. Маёй узнагародай былі вочы, якія аж свяціліся, і патрабаванні пагуляць яшчэ.

***— Вы адразу ўсе матэрыялы рабілі на беларускай мове?***

— Не, доўгі час усе мае гульні былі на рускай мове, бо школы, дзе я працавала, таксама былі рускамоўныя. Ужо стаўшы супрацоўнікам развіццёвага цэнтра, працавала са школьнікамі малодшых класаў, і наша задача была дапамагчы дзецям зрабіць хатняе заданне і падцягнуць па тых прадметах, па якіх у малых узнікалі цяжкасці. І гэта была не матэматыка, а беларуская мова! Часоў на прадмет у першым-другім класах адводзіцца няшмат, а матэрыял даволі складаны, калі ўлічваць, што і бацькі найчасцей рускамоўныя. Каб гэтых дзетак заматываваць вывучаць родную мову і зрабіць яе цікавай, я стала рабіць для іх гульні і на беларускай мове. Бацькі сталі хваліць дзяцей, бо іх адзнакі па мове пачалі паўзці ўверх.

***— Як атрымалася, што ваша спроба зацікавіць дзяцей мовай стала паспяховым праектам на Рэспубліканскім конкурсе «Social Weekend»?***

— Навакольныя і знаёмыя сталі адкрыта мне прапаноўваць паўдзельнічаць у конкурсе, бо бачылі, як гэта цікава дзецям і педагогам. Я не вельмі амбіцыйны ў гэтым плане чалавек, таму, мабыць, калі ўдзельнічала першы раз, у мяне не атрымалася. Але галасоў не хапіла зусім крышачку. Шанц меўся, і было відавочна, што ў людзей ёсць зацікаўленасць маім праектам. Падчас першай спробы я знайшла цудоўную мастачку, якая зрабіла мне 7-8 гульняў у электронным выглядзе. Памятаю тую радасць ад усведамлення, што справа тваіх рук пераходзіць на новы ўзровень. Я за ўласныя грошы надрукавала першы тыраж гульняў і прапанавала сваім калегам, сябрам і вучням пагуляць у іх. Тады атрымала шмат добрых водгукаў і падзяк. Таму і прыняла рашэнне паўдзельнічаць у конкурсе другі раз. І ў мяне ўсё атрымалася.

***— Што асабіста атрымалі ад удзелу ў конкурсе?***

— На самай справе гэты конкурс — вельмі крутая ідэя. На працягу ўсяго часу нас вучылі спецыялісты высокага ўзроўню з розных сфер дзейнасці прасоўваць свае праекты. Мы мелі магчымасць прыходзіць на розныя лекцыі і майстар-класы, дзе нас вучылі, як стварыць прыватны бізнес, як пісаць пасты ў сацыяльных сетках, як працаваць са СМІ. Пасля кожнага курса мы павінны былі рабіць дамашнія заданні: ці стварыць у сацсетках сваю суполку, дзе будзе не адзін-дзесяць удзельнікаў, а нашмат больш, ці зрабіць прэзентацыю праекта так, каб інвестары захацелі ўкласці ў яго грошы, ці зацікавіць журналістаў ідэяй, каб выданне згадзілася апублікаваць пра гэта матэрыял. І потым, з часам, мы мусілі прадставіць свой праект спачатку ў чвэрцьфінале, потым — у паўфінале, а потым — і ў фінале. Папраўдзе я не спадзявалася, што ў мяне атрымаецца прайсці ў фінал. Удзел у конкурсе даў магчымасць зразумець, што мая ідэя падабаецца грамадству, і таму яна можа калі-небудзь стаць маім заробкам. Напачатку тры гульні на тысячу асобнікаў былі надрукаваны з дапамогай донараў, але гэтага аказалася недастаткова. Каб гульні з'явіліся на паліцах кнігарняў, трэба было зрабіць для іх сертыфікат і штрыхкоды. З гэтым мне таксама дапамаглі арганізатары конкурсу. Цяпер я ведаю, як што робіцца.



***— Вы працягваеце распрацоўваць новыя гульні?***

— Так. І ў мяне з'явілася большая аўдыторыя, дзе магу паказаць навінкі і ўбачыць, ці будзе яна папулярнай сярод пакупнікоў. Сёння мае гульні можна набыць у буйных і вядомых кнігарнях — «Белкніга», «Акадэмкніга», а таксама ў прыватных крамах. Мяне пачалі запрашаць на спецыяльныя гульнятэкі, і вось там я паказваю свае навінкі. Працуе сайт skarbonkagulnjau.net, на якім можна даведацца аб кожнай гульні больш падрабязна. Сёння ёсць ужо больш за сорак беларускамоўных гульняў для дзяцей. Я распрацоўвала гульні для дзетак з чатырох гадоў, але заўважыла па водгуках, што набываюць іх і для малечы двух-трох гадоў, бо на картках намаляваны яркія карцінкі. Калі дзіця пачынае чытаць, то падпісаныя словы можна выкарыстоўваць для замацавання навыкаў чытання.

Дарослыя апошнім часам таксама любяць пагуляць у настолкі. Неаднойчы бачыла, як бацькі на гульнятэках не вытрымліваюць і пачынаюць падказваць дзецям ці разам з малымі абмяркоўваюць заданне. Цяпер нярэдка падобныя мерапрыемствы ў бібліятэках і кнігарнях пераходзяць у спаборніцтвы паміж сем'ямі. Памятаю, як летам мяне запрасілі арганізаваць гульнятэку на лецішчы, дзе сабралася некалькі сем'яў. Але аказалася, што дзеці займаліся сваімі дзіцячымі справамі, а дарослыя «секліся» паміж сабой у беларускамоўныя гульні. Мне было вельмі прыемна назіраць за гэтым.

***— Як вы лічыце, з чым звязана такая вялікая цікавасць да вашых гульняў?***

— Магчыма, у краіне з'явілася пакаленне, якое ўсё больш цікавіцца сваімі каранямі, мовай і традыцыямі. Людзі заўважылі, што мова і традыцыі — гэта тая спадчына, якая робіць нас, беларусаў, унікальнымі. У нас вельмі прыгожая краіна, багатая мова, добрыя і таленавітыя людзі. Галоўнае — заўважыць гэта і зберагчы.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

---

Запрашаем да ўдзелу!

# ТВОРЧАСЦЬ + ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЕДЫ

**НАН Беларусі абвясціла Рэспубліканскі конкурс творчых работ, прысвечаны Году гістарычнай памяці.**

Ён накіраваны на ўмацаванне гістарычнай памяці беларускага народа і ўсведамленне бясспрэчных дасягненняў незалежнай Беларусі, фарміраванне пачуцця гонару за гераічнае мінулае і здзяйсненні сучаснай дзяржавы, кансалідацыю грамадства і ўмацаванне нацыянальнага адзінства, падтрымку таленавітых творчых людзей.

У конкурсе прадугледжана некалькі намінацый, накіраваных на папулярызацыю гістарычных падзей і дасягненняў сучаснай дзяржавы: «Найбольш значныя падзеі ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці», «Вялікая Айчынная вайна ў памяці маёй сям'і», «Выбітныя асобы беларускай зямлі», «Прыгажосць роднай зямлі», «Песні нашай Радзімы», «Мова маёй зямлі (мясцовыя дыялекты, геаграфічныя назвы, асабістыя імёны)», «Культура і побыт беларускага народа».

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца неабыякавыя і творчыя людзі, аматары і прафесіяналы, настаўнікі, школьнікі і студэнты, а таксама ўсе ахвотныя, работы якіх садзейнічаюць папулярызацыі гістарычных ведаў і дасягненняў сучаснага грамадства, служаць умацаванню нацыянальнага адзінства і грамадскай згоды. Пераможцы ў кожнай намінацыі ўзнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі прызамі.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца да 1 верасня 2022 года па электроннай пошце: koncurs2022@gmail.com, а таксама на адрас: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2. Кантактныя тэлефоны: + 375-17-270-07-76, 8-025-733-98-94, 8-029-157-84-41.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

Здарэнні

# 21 ЗУБР ПРАВАЛІЎСЯ ПАД ЛЁД У СВІСЛАЦКІМ РАЁНЕ

**Паводле інфармацыі, якая паступіла ў Мінпрыроды з Нацыянальнага парку «Белавежская пушча», паблізу вёскі Вялікія Масушыны на тэрыторыі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці знойдзены 21 зубр, якія праваліліся пад лёд. Жывёлы былі знойдзены ў акваторыі сажалкі на рацэ Мядзянцы (Навадворскае возера).**

Як паведамляе прэс-служба Мінпрыроды, па папярэдніх даных зубры знаходзіліся ў складзе статка колькасцю не менш за 100 асобін, частка з якіх загінула пры пераадоленні воднай перашкоды па лёдзе. Акрамя таго, на беразе ракі знойдзены загінулы сяголетак (зубр узростам 10-11 месяцаў), які быў загрызены драпежнікамі (верагодна, ваўкамі).

Усіх загінулых жывёл дасталі з-пад лёду. На месцы працуе камісія з удзелам прадстаўнікоў Свіслацкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Свіслацкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, раённай ветэрынарнай службы і навуковага аддзела, аддзела зубразнаўства і ветэрынарнай службы Нацыянальнага парку «Белавежская пушча».

Пасля завяршэння работы камісіі будзе апублікавана дадатковая інфармацыя адносна здарэння.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «ЦАРСКІ» КАРАГОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэтым разам нароўне са старэйшымі «царамі» калядаваў і атрад юнакоў — мясцовых школьнікаў. За незвычайнымі калядНікамі хадзіў натоўп турыстаў, якія прыехалі адмыслова на гэтае святочнае мерапрыемства. Мне асабіста давялося быць у калядным Семежаве чацвёрты раз, і кожны раз бачыў вялікую цікавасць гасцей да гэтага дзейства. А сёлета на сустрэчу са знакамітымі семежаўцамі прыехалі яшчэ і калядНікі з іншых вёсак раёна, якія паказвалі элементы абраду сваіх мясцін. Потым на пляцоўцы перад Домам культуры ўтварыўся вялікі карагод — як сімвал працягу жыцця, радаводу ды традыцый. А гэта азначае, што і спрадвечныя «Цары» будуць жыць!

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**











Не казка

# ЖМЕНЬКА СНЯЖЫНАК

— Глядзі, якая вялікая белая птушка, — абудзіў засяроджаных пасажыраў тралейбуса хлопчык, які ціхенька сядзеў ля акна, занятым аглядам дамоў пры дарозе.

— Не выдумляй, усе вялікія птушкі на зіму паляцелі ў вырай, — мама паспрабавала вярнуць сына ў маўкліва-прыстойны стан. А ён быў настойлівы:

— Ну паглядзі, паглядзі... Яна гуляе з сонейкам нібыта з мячыкам. — Мама азірнулася па баках з сарамліва-прабачлівай усмешкай за нечаканае парушэнне спакою, вярнуць у які малога аказалася няпроста. Відаць, на такі выпадак яна трымала ў кішэні цукеркі. Але хлопчык цягнуў за рукаў матулю, каб павярнулася да акна.

— Не, надта доўгі хвост, — нечакана адгукнуўся мужчына, на выгляд дзядуля якога-небудзь хлопчыка. — Больш падобна на лятак...

Тррр!.. Тралейбус здрыгануўся і стаў як укапаны. «Зараз кіроўца наладзіць вусікі і паедзем далей», — сказала мама з надзеяй пераключыць увагу хлопчыка. А ў яго было роўна адваротнае спадзяванне. І яна паглядзела ў акно.

Гэта была ўсяго толькі аблачынка. Дзіўнае спалучэнне пухнатых часцінак пара, што прынялі загадкавую форму, падпарадкаваўшыся рэзкаму парыву ветра. У сонечны зімовы дзень ці не адзіная аблачынка на чыстым блакітным небе. Таму сапраўды было падобна на тое, што жывая істота плыве ў небе, перабіраючы крыламі. Адно з іх вось-вось зачапіць дах найбліжэйшай высоткі, а другім яна імкнецца дацягнуцца да сонейка. Птушку адразу не заўважылі, як ужо даўно ўсе дарослыя перасталі ўглядацца ў неба і больш не задаюцца пытаннямі: куды час ад часу хаваецца сонца і што за сіла яго выцягвае з цемры?..

Ды без розніцы, што там уяўленне можа нафантазіраваць. Ці не ўсё роўна, што хаваецца ў вялікіх шэрых пухнатых хмарах? Жыццё ж куды больш шматаблічнае і цікавае: дзетак гадаваць, на работу хадзіць. І — што вы да мяне прычапіліся са сваёй фантазіяй? — займацца сваімі справамі. Прыкладна такая самая трывалая філасофія жыцця — на ўсе часы. І людзі гатовыя таптаць зямлю ў любым месцы, у любых умовах, у любых нават бывалых ботах. Рэалісты.

У мажнага дзецюка ў шэрых цёплых нагавіцах зазвінела ў кішэні. На твары павісла раздражненне: задоўга стаім. Зімой на дарозе бывае складана, планы пад пагрозай. Што там хтосьці кажа: абы не сарваліся гады. А гэты сённяшні дзень — такі рэальны і так хутка можа скончыцца, кожная хвіліна на ўліку.

— Ну праўда ж? — Шукала падтрымкі сваім думкам цётачка з раздутым пакетам прадуктаў на каленях. Тым не менш не здолела ўтрымаць цікаўнасць. Падалося, сама была здзіўлена: у яе з'явіліся эмоцыі. Але яна б не паверыла сабе, каб не знайшла падтрымкі ў іншых.

— Чалавек! З доўгімі нагамі, — выдала дзяўчына, якая ўсю дарогу тулілася да хлопца. А цяпер, калі тралейбус стаў, яны разам разглядалі неба над дарогай. — А рукі шырока раскінуў — сонца абняць хоча.

Бабулька на сядзенні каля кіроўцы задуменна паглядзела скрозь пасажыраў:

— Дык анёл жа гэта...

Белая пухнатая істота, што ахінала горад, павярнулася другім бокам і паказала паружавелы ў промнях вечаровага сонца твар — быццам напоўнены жыццём. Адно з крылкаў распушылася, і з неба высыпалася жменька дробных сняжынак, вецер аднесіў іх далей ад разагрэтага нашым дыханнем шкла, скіроўваў наперад, і яны нібыта ўцягнулі наш тралейбус у мяккі і павольны паветраны рух.

Мужчына з тэлефонам выскачыў на сваім прыпынку. Цётачцы дапамагла спусціць пакеты маладая пара. Пасля развітаўся з малым чыйсьці дзядуля.

— А дзе цукерка? — здзівілася мама, што сын прыхаваў смакату.

— Тату перадам, у лякарню.

— Ад птушкі? — пацікавілася бабуля.

— Не, ад анёлка.

Быў звычайны зімовы дзень. Людзі, як тыя сняжынкі, высыпаліся з дзвярэй на вуліцу, іх падхоплівaў натоўп і раскідваў па дарозе, каб заўтра зноў закружыць у віры жыцця: сабраць у жменькі і скіраваць па справах. Нічога незвычайнага. Але чамусьці здаецца, што вечаровы змрок — гэта ўсяго толькі цень белай пухнатай істоты, якая жыве над горадам. Ці не таму снежнай зімой нават уночы бывае святло?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# З НОВАГА ГОДА — НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

## Як не дазволіць лянівому арганізму камандаваць сабой, калі на вуліцы холадна?

**Напэўна, не так проста знайсці тых, хто не абяцае сабе пачаць з новага года новае жыццё — больш усвядомленае, поўнае карысных заняткаў, без ляноты і пракрастынацыі. І заняцца нарэшце сваёй фізічнай формай! Але дні ўсё яшчэ карацейшыя за ночы, сонейка прачынаецца пазней за нас і па-ранейшаму няпроста падняць сябе з канапы: зімовая спячка — яна такая! Але вясна ўсё ж прыйдзе, і сустрэць яе лепш спартыўнымі і падцягнутымі.**



Мы спыталі ў розных трэнераў, што трэба зрабіць, каб першая трэніроўка не стала апошняй... Не, гаворка не пра траўмы, а пра той выдатны сцэнарый, па якім развіваюцца адносіны з фізічнай актыўнасцю ў вельмі многіх дарослых людзей, якія не здолелі пасябраваць са спортам у дзяцінстве. Звычайна ён такі: цвёрдае рашэнне; першы тыдзень, у некаторых выпадках месяц — рэзкі старт, актыўныя трэніроўкі, рашучы настрой стаць найлепшай версіяй сябе; наступны тыдзень (месяц, калі вы ўпартыя і быццам бы заматываваныя) — боль у мышцах, апатыя, пытанні кілаграмаў «Мне гэта трэба?», першыя пропускі трэніровак; фінальны этап — «я з радасцю б, але няма часу», «нешта не склалася», «фізуха — гэта не маё», «лепш на дыеце пасяджу». І самае любімае: «Пачакаю лета і пачну бегаць па раніцах» (так-так, вядома, верым!).

Рэгулярнасць — аснова любых дасягненняў, кажуць трэнеры, яна дапамагае дамагчыся выніку. А дасягнуць рэгулярнасці можна, толькі маючы правільную матывацыю да заняткаў. Бо ўсё, што адбываецца ў нашым жыцці, у першую чаргу адбываецца ў нас у галаве.

### ФІТНЕС

— Калі чую пытанне, як прыйсці ў форму да вясны, заўсёды адчуваю здзіўленне: не разумею, навошта запускаць сваю фізічную форму з прыходам зімы, каб потым трэба было тэрмінова «ў яе прыходзіць». І наогул, пры чым зіма або любая іншая пара года да ляноты? — кажа фітнес-трэнер Павел Фархадаў. — Улетку пэўныя віды нагрузак больш арганічныя, але ёсць тыя віды фізічнай актыўнасці, якім значна лепш падыходзіць зіма. Напрыклад, сілавыя трэніроўкі ў зале. Не падабаюцца сілавыя трэніроўкі? Цяпер практычна ў любым горадзе ёсць мінімум адзін басейн і можна знайсці вельмі недарагія абанементы. У Беларусі маюцца выдатныя гарналыжныя комплексы — да таго ж зімовыя віды спорту зараз у модзе. Таксама закрытыя каткі, каб катацца на каньках. Да вашых паслуг дасведчаныя трэнеры практычна па любых відах спорту, прычым ствараюцца групы не толькі для дзяцей і юнацтва ў розніцы на спартыўныя дасягненні, але і для дарослых, хто жадае атрымаць новыя веды і навыкі, разнастаіць сваё жыццё. І зімой, і летам ёсць магчымасць фізічнай актыўнасці на любы густ — галоўнае, каб было жаданне.

***— Ці ёсць у фітнесе сезоннасць?***

— Так, і якраз цяпер пік: пасля Новага года людзі звычайна вырашаюць, што пара пачаць новае жыццё і пасябраваць з фізічнай актыўнасцю. Галоўнае, каб гэтая рашучасць не скончылася праз два тыдні... Наплыў у фітнес-цэнтры таксама бывае ў верасні («новае жыццё з новага вучэбнага года ў ВНУ або вучэбнага года дзяцей»), потым бліжэй да Новага года аматараў ЗЛЖ менш. Студзень — наступны пік. І потым у сакавіку — красавіку падцягваюцца «спрынтары», якім трэба тэрмінова скінуць лішнія кілаграмы да цёплага сезона. Калі мы здымаем пухавікі і — «ой, а я, аказваецца, за зіму дадаў(ла) у вазе!».

***— А якая матывацыя прыводзіць сучаснага чалавека ў фітнес-цэнтр?***

— «Падставы» звычайна тры. Першая самая распаўсюджаная: «Хачу падцягнуць



фігуру да вясны» або «...да водпуску, каб добра выглядаць на пляжы». Гэта самы звычайны матыў, і, на жаль, такая матывацыя прагназуе чалавеку правал. Больш доўгачасовы матыў — калі чалавек бачыць хоць нейкую перспектыву. Гэта «хачу, каб мне прыемна было глядзець на сябе ў люстэрка». Працуе толькі трэці від матывацыі — трэніроўкі дзеля ўласнага здароўя. Менавіта гэтая матывацыя забяспечвае поспех: прыгожую постаць, правільныя прапорцыі цела і задавальненне ад адлюстравання ў люстэрку. Таму што толькі здароўе дае знешнюю прыгажосць.

***— Ці бывае, што няправільная матывацыя з часам мяняецца на правільную?***

— Бывае, і даволі часта. І тады заняткі будуць эфектыўныя. Калі першаснае «хачу скінуць шэсць — восем кілаграмаў» або «хачу вось тут падкачаць» змяніцца на правільны матыў «хачу быць здаровым і адчуваць сябе поўным сіл» — усё атрымаецца. І гаворка не толькі аб знешнасці. Ведаеце, у інтэрв'ю спартсменаў часта можна сустрэць такія словы: «Спорт змяніў маё жыццё». Дык вось, гэта не вобразны выраз. Любы спорт, і фітнес у тым ліку, вучыць ставіць мэты і працаваць для іх дасягнення, робіць чалавека спакойным і ўпэўненым у сваіх сілах. І часта — я сам бачыў такія прыклады — змяняе да лепшага не толькі знешнасць, але і псіхалогію і ў цэлым жыццё чалавека.

### ТРЭНАЖОРНАЯ ЗАЛА

— Цяпер аб матывацыі модна разважаць. Ёсць мноства матывацыйных відэа, нават матывацыйныя трэнеры. Але вось якое пытанне ў мяне ўзнікае: навошта наогул патрэбна нейкая адмысловая матывацыя, каб паступаць правільна? — кажа інструктар адной з сетак трэнажорных залаў Мікіта Сушчэня. — Навошта нейкая асаблівая матывацыя, каб, напрыклад, клапаціцца пра сваё здароўе? Проста ўстаньце перад люстэркам — вам падабаецца? Калі так — не ідзіце ў трэнажорку. А калі не — якая яшчэ вам патрэбна матывацыя?

***— Кажуць, трэнажорная зала падыходзіць далёка не ўсім...***

— Не пагаджуся. Але, сапраўды, многія прыходзяць да такой высновы — у выпадку, калі займаліся без трэнера. Прафесійны інструктар важны ў трэнажорнай зале — хоць бы на пачатковым этапе. Бо, каб дамагчыся выніку, трэба рухацца паэтапна, дакладна вызначыўшы план. Спачатку важна прыйсці ў агульную фізічную форму, павысіць цягавітасць, падрыхтаваць да нагрузак мышцы і звязкі і толькі потым прыступаць да прапрацоўкі асобных груп мышцаў. Калі гэтага не зрабіць — вось тады і ўзнікае нелюбоў да трэнажоркі як вынік траўмаў і назапашанай стомленасці.

***— А ле ж жанчыны і мужчыны імкнуцца да рознага выніку, калі прыходзяць у трэнажорную залу...***

— Ёсць стэрэатып, што трэнажорка больш падыходзіць мужчынам, а жанчыны могуць ад сілавых трэніровак стаць менш жаноцкімі. Гэта вельмі распаўсюджанае меркаванне, але яно далёка

**Рэгулярнасць — аснова любых дасягненняў, кажуць трэнеры, яна дапамагае дамагчыся выніку. А дасягнуць рэгулярнасці можна, толькі маючы правільную матывацыю да заняткаў. Бо ўсё, што адбываецца ў нашым жыцці, у першую чаргу адбываецца ў нас у галаве.**

ад ісціны. Дзяўчаты-бодзібілдаршы, якіх можна ўбачыць у інтэрнэце, трэніруюцца па спецыяльных праграмах і прыкладаюць шмат намаганняў, каб накачаць пэўныя групы мышцаў. А наогул жаночы арганізм, у адрозненне ад мужчынскага, не выпрацоўвае неабходныя для набору мышачнай масы гармоны, і без спецыяльных трэніровачных праграм фігуру бодзібілдаршы жанчыне не атрымаць. Таму эфект ад заняткаў на трэнажорах у мужчын і жанчын будзе розны. Дзяўчатам яны дапамагаюць зрабіць постаць больш жаноцкай, а мужчынам — больш мужнай.

***— Дылетанцкае пытанне: праз які час рэгулярных трэніровак (дапусцім, двойчы ў тыдзень) можна будзе ўбачыць у люстэрку нейкі станоўчы вынік?***

— Гэта заўсёды індывідуальна. І першы вынік вы не ўбачыце ў люстэрку. Вы спачатку яго адчуеце. Гэта яскравае паляпшэнне самаадчування. Знікне санлівасць, сыдзе дрэнны настрой, млявасць і апатыя — звычайныя спадарожнікі зімы ў нашых шыротах. А пазней прыйдуць і першыя знешнія перамены. Крыўдна, калі кідаюць хадзіць у залу, не дайшоўшы да гэтага моманту. Так бывае, калі чалавек першапачаткова прыходзіць трэніравацца, як мы кажам, «дзеля сэлфі». І пакідае заняткі на тым этапе, калі закладваюцца вынікі, якія парадуюць праз месяц-паўтара. Калі гэты этап пройдзены, вы ўжо не кінеце, таму што трэнажорка зацягвае. Тут усё пабудавана на руху ад выніку да выніку, на добразычлівасці, узаемадапамозе і пачуцці агульнасці — як і ў любым спорце.

### ЁГА

— Тое, што фізічная актыўнасць павінна быць у жыцці любога чалавека, — аксіёма. Але вельмі часта людзі шукаюць не падставу прыйсці ў ёга-цэнтр або трэнажорную залу, а падставу гэтага не рабіць. Між тым часта ў нас няма праблем з тым, каб знайсці час нанесці свайму здароўю шкоду, — кажа трэнер па ёзе Мілана Гаравец. — На сядзенне ў сацсетках, на вячоркі з сяброўкамі ў піцэрыі, на каву з каларыйнымі прысмакамі і гэтак далей. Мне здаецца, часта мы недаацэньваем свае сілы. Калі, гледзячы ў люстэрка, уяўляць, колькі трэба працы, каб зрабіць сваю постаць больш падцягнутай — хутчэй за ўсё, у вас апусцяцца рукі. На самай справе чалавек па прыродзе хутчэй схільны да песімізму, чым да аптымізму. Ды многае ў жыцці сапраўды залежыць толькі ад нас — у тым ліку знешнасць і самаадчуванне.

***— Ці ёсць нейкія прыёмы і хітрасці, якія дапамогуць «уцягнуцца» і не кінуць заняткі спортам на тых этапах, пакуль вынікі яшчэ не прыкметныя?***

— Я назвала б некалькі прынцыпаў, якія садзейнічаюць эфектыўнасці трэніровак. Але самае галоўнае ўсё роўна — уласнае рашэнне не плыць па цячэнні, а стаць гаспадаром свайго жыцця. Такім чынам, прынцыпы наступныя:

✓ ***Прывядзіце сябра***

Разам лягчэй пераадольваць ляноту і стомленасць: калі некаму аднаму будзе «не ахвота», другі падбадзёрыць і падтрымае. Па статыстыцы, калі людзі прыходзяць займацца ўдваіх, яны значна даўжэй наведваюць трэніроўкі, займаюцца больш інтэнсіўна і хутчэй дасягаюць вынікӑ.

✓ ***Знайдзіце сімвал***

Набудзьце прыгожую форму для трэніровак. Форма стане сімвалам вашага рашэння пасябраваць са спортам і дадасць сіл і жадання выглядаць прывабна. Яшчэ адным сімвалам можа стаць, напрыклад, дыван для ёгі. Так, можна скарыстацца агульным (яны заўсёды ёсць у залах), але свой уласны сімвалізуе, што ёга цяпер — частка вашага жыцця.

✓ ***Стварыце куміра***

Магчыма, гэта здасца вам смешным, але гэта працуе. Нават калі ў дзяцінстве ў вас не было куміра, вырашыўшы заняцца спортам (няхай гэта будзе ёга, трэнажорка або любы іншы від актыўнасці), самы час яго стварыць. Вы хацелі б выглядаць, як... хто? Павесьце постар з абраным ідэалам на сценку, усталюйце «абоі» на рабочым стале або проста трымайце вобраз перад мысленным зрокам — ён дапаможа вам не страціць матывацыю.

✓ ***Уставайце са світаннем***

Калі раніцай вы валяецеся ў ложку да апошняга, а потым стрымгалоў несяцеся на работу, то ўвечары, хутчэй за ўсё, будзеце адчуваць сябе «выціснутым лімонам», здольным толькі на прагляд серыяла. Раняе абуджэнне валодае магіяй: яно зараджае бадзёрасцю. Асабліва калі пачаць свой дзень з зарадкі, абсалютна любой, а не па нейкай адмысловай методыцы.

✓ ***Шукайце — і знойдзеце***

Відаў фізічнай актыўнасці мноства — можна знайсці тое, што падыдзе менавіта вам. Наведвайце трэніроўкі розных трэнераў, тым больш многія запрашаюць на пробныя заняткі бясплатна. Не бойцеся, здавалася б, зусім «не падыходзячых вам» варыянтаў. І абавязкова знойдзеце той кірунак, які з'яднае вас са спортам на доўгія гады.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 2: цилиндр для расщипки, увлажнения и соусирования (106) зав. 01-120-422, 2002 г. в.
Начальная цена продажи лота – 66 000 руб. (шестьдесят шесть тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 6 600 руб. (шесть тысяч шестьсот рублей)

ЛОТ 3: цилиндр соусирования (205) зав. 01-120-123, 2002 г. в.
Начальная цена продажи лота – 39 600 руб. (тридцать девять тысяч шестьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 3 960 руб. (три тысячи девятьсот шестьдесят рублей)

ЛОТ 7: запасные части:
- ВАЛ РОХЛИКС 3410410231 РП.2 (2 шт.)
- ВТУЛКА 3410710040 (12 шт.)
- ВТУЛКА НАПР. ВЕРХНЯЯ 3410410060 РП.48
- Выдвижной воздуховод 3410110352 (левый) 3410110353 (правый) РП.89 (4 шт.)
- ЗАЖИМНАЯ ПЛИТА Э.3410110136 (28 шт.)
- ЗАТОЧНОЙ КАМЕНЬ 3410410100 (104 шт.)
- КОЛЕСО ЧЕРВЯЧНОЕ 3410110122 РП.96 (5 шт.)
- КОНТРЛЕЗВИЕ 3410210284 (13 шт.)
- КОРПУС 3410410006
- КОРПУС ПОДШИПНИКА
- КРОНШТЕЙН 3410710015 (2 шт.)
- Муфта обгонная 3410112368 РП.97 (11 шт.)
- МУФТА СЦЕПЛЕНИЯ 3410410068 (9 шт.)
- НАПРАВЛЯЮЩАЯ ВЕРХНЕГО ТРАНСПОРТЕРА НИЖНЯЯ РП.95
- НАПРАВЛЯЮЩАЯ КОНВЕЙЕРА НИЖНЯЯ 3410710523 (2 шт.)
- НАПРАВЛЯЮЩАЯ ТОПА 3410710035 РП.36 (2 шт.)
- НАТЯЖНОЙ БАРАБАН 3410730083
- НИЖНИЙ ВАЛ 3410510242
- НОЖ Э341.071.0036-09 РП.46
- НОЖИ СТАЛЬНЫЕ 3410110140 РП.31 (1650 шт.)
- ОСЬ ШАРНИРА 3410110142 (6 шт.)
- ПЛАНКА 34101110143 (10 шт.)
- ПЛАНКА РП.19 (4 шт.)
- ПЛАНКА ФОРМИРОВАНИЯ ТОПА 3410710036 (5 шт.)
- ПЛАНКА РП 8 (2 шт.)
- ПОДПЯТНИК 3410110137 (10 шт.)
- ПРИВОДНОЙ БАРАБАН 3410710084
- ПРИВОДНОЙ БАРАБАН 3410510241
- Раструбно-футеровочный блок Э.3410210524 СБ РП.87
- Раструбно-футеровочный Э.3410210525 СБ РП.87/1
- СКАЛКА GD 5 3410410072 (15 шт.)
- СТАНИНА КОНТРЛЕЗВИЯ 3410210240 SD5
- Стойка Э.3410210524 РП.87/2 (4 шт.)
- Толкатель 3410110810 РП.35 (13 шт.)
- ТОЛКАТЕЛЬ 341011810 (4 шт.)
- ЧЕРВЯК 3410110121 (10 шт.)
- ЧЕРВЯК Э(СД-5) РП.16 (4 шт.)
- ШТОРА ЗАЩИТНАЯ 3410410158 (6 шт.)

Начальная цена продажи лота – 366 199,53 руб. (триста шестьдесят шесть тысяч сто девяносто девять рублей пятьдесят три копейки) с учетом НДС.
Сумма задатка – 36 620 руб. (тридцать шесть тысяч шестьсот двадцать рублей)

ЛОТ 8: запасные части:
- ПОВОРОТНАЯ ПЛОЩАДКА 0072034
- РАМА СЛАЙСЕРА X06SLISC1000.

Начальная цена продажи лота – 29 332,29 руб. (двадцать девять тысяч триста тридцать два рубля двадцать девять копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 2 933 руб. (две тысячи девятьсот тридцать три рубля)

Продавец – Открытое акционерное общество «Гродненская табачная фабрика «Неман», 230771, г. Гродно, ул. Орждоникидзе, 18. Тел. 79-15-00, факс. 79-15-54

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

